

13 сакавіка, 8 МОЙ

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**

**Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.**



**Запомніце гэтае імя: Паліна Русецкая. Салістка Беларускага балета заваявала залаты медаль міжнароднага конкурсу «Танцавальны алімп», што праходзіць у Берліне.**

СТАР. 7



**Бос на абцасах... Такога і слухацца прыемна, і пярэчыць яму не хочацца. А беларускія жанчыны ўмеюць быць не толькі прыгожымі, але і ў бізнэсе разбіраюцца.**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 САКАВІКА 2012 г. СУБОТА № 46 (27161) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА:

## «ЖАНЧЫНЫ АДОРАНЫ ВЯЛІКАЙ СІЛАЙ ЛЮБОВІ І СУПЕРАЖЫВАННЯ, ЯКАЯ ЗМЯНЯЕ СВЕТ»

**Жанчыны адораны вялікай сілай любові і суперажывання, якая сапраўды змяняе свет. Гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў 7 сакавіка на ўрачыстым прыёме ад імя кіраўніка дзяржавы, прысвечаным Дню жанчын.**

«З першымі вясеннімі днямі ў нашы дамы ўваходзіць цудоўнае свята жанчын. Па добрай традыцыі з ім мы звязваем шанаванне маці, глыбокую павагу да прадстаўніц прыгожай палавіны чалавецтва, захапленне іх прыгажосцю і душэўнасцю, — адзначыў Прэзідэнт. — Вы натхняеце мужчын на выдатныя здзяйсненні і дасягненне новых вышынь у розных сферах нашага жыцця».

«Вы адораны вялікай сілай любові і суперажывання, і яна сапраўды змяняе свет. Ваша душэўная цеплыня і спагада падтрымліваюць у цяжкую хвіліну, вяртаюць веру і надзею. І сёння мы гаворым сардэчныя і шчырыя словы ўсім жанчынам, якія ідуць па жыцці побач з намі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Вы — захавальніцы сямейнага ўкладу і духоўных каштоўнасцяў, правераных стагоддзямі. Вы ўвялі нас у свет і пастаянна дапамагаеце сваёй мудрасцю і клопатам. Усё лепшае ў нас закладзена менавіта вамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прадстаўніц прыгожага полу.

Як адзначыў Прэзідэнт, няма такой прафесіі, роду дзейнасці, дзе жанчыны не займалі б дастойныя месцы. «Вы ніколі не стаялі ў баку ад самых злабадзённых праблем грамадскага жыцця. Вы адчуваеце час, умееце прымаць нестандартныя рашэнні, а калі гэта неабходна, ісці на кампрамісы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў жанчынам за сардэчнасць і цярпенне, мудрасць і разуменне, за невычэрпную дабрату і ўменне рабіць свет ясным, радасным і па-сапраўднаму вясеннім. Прэзідэнт таксама пажадаў жанчынам шчасця, міру і сямейнага дабрабыту, каб ажыццяўляліся іх запаветныя мары: «Няхай будзе сапраўднае моцнае плячо, на якое вы заўсёды можаце абаперціся».

На прыём былі запрошаны жанчыны з усіх рэгіёнаў Беларусі, якія дабіліся поспехаў і прызнання ў розных сферах дзейнасці.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ МЕРЫ ПА ЎДАСКАНАЛЕННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ СТЫМУЛЯВАННЯ ЭКСПАРТУ

**У мэтах удасканалення нацыянальнай сістэмы стымулявання экспарту, а таксама механізмаў страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 6 сакавіка Указ № 126 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 534».**

«Дакумент прадугледжвае прадастаўленне банкамі экспартных крэдытаў у беларускіх рублях па працэнтнай стаўцы ў памеры дзвюх трэціх стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, кампенсацыю страт банкам ад прадастаўлення экспартных крэдытаў у валюце прадастаўленага крэдыту, прадаўжэнне тэрміну завяршэння знешнегандлёвай аперацыі на перыяд чакання і выплаты страхавой кампенсацыі па дагаворы страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы без дазволу Нацыянальнага банка, а таксама ўвядзенне новага віду страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы — добраахвотнае страхаванне экспартнага факторынгу», — праінфармавалі ў прэс-службе. У мэтах скарачэння тэрмінаў выдачы экспартных крэдытаў указам вызначана, што кампенсацыя страт банкам ад прадастаўлення экспартных крэдытаў у памеры, не большым за $500 тыс. у эквіваленце, будзе праводзіцца па рашэнні Міністэрства фінансаў, якое прымаецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Беларусі.

## АЙЧЫННАЕ — ПА МАКСІМУМУ

**У Беларусі ствараюцца ўмовы для максімальнага выкарыстання айчыннага абсталявання і матэрыялаў пры будаўніцтве міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва. Адпаведны Указ № 128 «Аб унясенні дапаўнення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2005 года № 58» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 6 сакавіка.**

У прыватнасці, ураду ўказам прадастаўлена права без правядзення падрадных таргоў вызначаць генеральную праектную арганізацыю, генеральную падрадную арганізацыю, субпадрадную праектную, будаўнічую і іншыя арганізацыі на будаўніцтва аб'ектаў, уключаных у дзяржаўную праграму будаўніцтва энергакрыніц на мясцовых відах паліва (па пераліку аб'ектаў, якія вызначаюцца Саветам Міністраў па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь). Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## МАЛАКО ДЛЯ «МАЦАРЭЛЫ»



Алеся, Рыгор і іх малодшая сястра Кацярынка растуць сапраўднымі памочнікамі ў сваёй сям'і. А сям'ю Віктара і Таццяны Бароўскіх з вёскі Прыстромы ў Смалявіцкім раёне ведаюць як адну з самых актыўных прыхільнікаў здачы дзяржаве малака. Толькі за мінулы 2011 год яны здалі 35 тон і занялі другое месца ў сваім раёне сярод гэткіх жа сялянскіх рупліўцаў. Тлустасць малака і яго якасць настолькі добрыя, што адно са сталічных прадпрыемстваў пачало з яго выраб сыру гатунку «мацарэла». Выкарыстоўваецца малако з гэтай сядзібы і ў грузінскай кухні сталічнага рэстарана «Тыфліс».

Клопатаў на падвор'і з жывёламі мала не бывае. А ў гаспадарцы Бароўскіх цяпер нават восем рагуль. Ёсць і свойскі конік. Хапае працы і дарослым, і дзецям. Дарма, што яшчэ малыя, што школьная нагрузка ў дзяцей вялікая і што ў пазашкольным жыцці яны занятыя. Асабліва даспадобы малым памочнікам догляд жывёл — кармленне, выгул жывёл (на фотаздымку). Нават завіруха — нярэдкая з'ява ў сакавіку — не перашкаджае ў гэтай працы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Смалявіцкі раён.*

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна ШЧОТКІНА:**

***Пераразлікі працоўных пенсій у сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы ў 2012 годзе будуць ажыццяўляцца штоквартальна. Цяпер сярэдні памер працоўнай пенсіі па ўзросце складае Br1 млн 270 тыс.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.03.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8170,00 ▼ |
| Еўра | 10730,00 ▼ |
| Рас. руб. | 275,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1015,85 ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 7° |
| Віцебск | + 1° |
| Гомель | – 4° |
| Гродна | + 3° |
| Магілёў | – 2° |
| Мінск | + 3° |

# МІНЭКАНОМІКІ СЁЛЕТА НЕ БАЧЫЦЬ ПАТРЭБЫ Ў АСЛАБЛЕННІ КУРСУ РУБЛЯ

**Пра ключавыя асаблівасці знешнеэканамічнай дзейнасці ў няпростым 2011 годзе і пра ўмовы яе ажыццяўлення сёлета журналістам расказаў Раман БРОДАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Міністэрства эканомікі. Па яго словах, сёння вельмі важна даваць аб'ектыўную інфармацыю пра найбольш значныя фактары, якія ўплывалі на знешнеэканамічную дзейнасць у 2011 годзе і якія застаюцца зараз. Бо «домыслы і некампетэнтныя разважанні непазбежна выклікаюць рэакцыю эканамічных агентаў і, як наступства, няправільную трактоўку эканамічных працэсаў». А ва ўмовах рыначнага курсаўтварэння эмацыйны складнік можа паспрыяць як умацаванню, так і аслабленню нацыянальнай валюты, што, у сваю чаргу, можа «не толькі фарміраваць настроі людзей, але і штурхаць бізнэс для прыняцця няправільных рашэнняў».**

### Дык вінаватыя аўтааматары ў валютным крызісе ці не?

Па словах Рамана Бродава, Нацыянальны банк яшчэ фарміруе канчатковы варыянт плацежнага балансу за 2011 год, але пэўныя даныя ён усё ж такі пракаментаваў:

— Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў 2011 годзе склала мінус 1,638 млрд долараў. Гэта ў 4,5 раза лепш за вынікі 2010 года, а таксама гэта лепшае значэнне за апошнія 6 гадоў, — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Мінэканомікі. — Дэфіцыт знешняга гандлю ў 2011 годзе склаў каля 3% ВУП — гэтае значэнне знаходзіцца ў зоне эканамічнай бяспекі. Безумоўна, важнай акалічнасцю з'яўляецца тое, што ў 2011 годзе Беларусь плаціла экспартную пошліну на экспартуемыя за межы Мытнага саюза нафтапрадукты (у бюджэт РФ згодна з падпісанымі пагадненнямі. — **Аўт.**), але нават з улікам гэтага знешнегандлёвы баланс Беларусі ў 2011 годзе атрымаўся лепшы за 2010 год у два разы.

Раман Бродаў падкрэсліў, што эканамічныя паказчыкі 2011 года былі сфарміраваныя ў тым ліку і некаторымі фактарамі, з якімі наша краіна сутыкнулася ўпершыню, але яны аказалі вялікі ўплыў на прыток і адток валюты з краіны. Напрыклад, у мінулым годзе вельмі значнымі атрымаліся як масавы ўвоз аўтамабіляў, так і іх рээкспарт — апошні, дарэчы, склаў больш чым 1 млрд долараў. Пры гэтым, як адзначыў Раман Паўлавіч, нягледзячы на такі вялікі аб'ём рээкспарту аўтамабіляў, іх масавы ўвоз усё-такі аказаў вялікі ціск на валютны рынак у першым паўгоддзі:

— Асноўны адток валюты, звязаны з імпартам аўтамабіляў, прыйшоўся на першае паўгоддзе — такім чынам уся нагрузка ў памеры больш як 2 млрд долараў была ажыццёўлена ў вельмі кароткі перыяд — з лютага па чэрвень. А экспарт аўтамабіляў, у асноўным, быў у канцы года, таму разрыў паміж прытокам і адтокам валюты, безумоўна, стаў вельмі значным фактарам, якія аказаў ціск на валютны рынак.

Таксама Раман Бродаў адзначыў яшчэ некаторыя спецыфічныя фактары, якія назіраліся ў 2011 годзе, — высокі попыт на спажывецкія тавары айчыннай вытворчасці і на адносна таннае паліва. Гэта фарміравала пэўны прыток валюты ў краіну — праўда, у наяўнай форме. Усяго ж экспарт тавараў і паслуг за 2011 вырас на 56,1%, імпарт — на 29,3%. Па словах Рамана Паўлавіча, такое апярэджанне тэмпаў росту экспарту над тэмпамі росту імпарту (на 26-27 працэнтных пунктаў) з'яўляецца рэкордным для Беларусі. Прычым ён падкрэсліў, што вартаснае значэнне экспарту тавараў і паслуг таксама рэкорднае: яно склала па выніках 2011 года амаль 46,7 млрд долараў і на 26% перавышае ўзровень 2008 года, які лічыцца самым паспяховым у камерцыйным плане для нашай краіны.

— Вельмі важна адзначыць, што гэта сумленны прырост — ён дасягнуты не паказчыкамі цэн на экспартную прадукцыю і не паказчыкам імпартуемай інфляцыі да нас у краіну. Справа ў тым, што мы паставілі на экспарт у фізічным выражэнні на 17,5% больш, чым у 2008 годзе. Таму важнай з'яўляецца не толькі валютная выручка, якая паступае ў краіну, але і рост фізічных паставак: ён адлюстроўвае новыя нішы, якія таваравытворцы занялі ў 2011 годзе. І прашу ўлічыць, што гэта адбылося ў час спаду эканамічнай актыўнасці нашых гандлёвых партнёраў, — падкрэсліў прадстаўнік Мінэканомікі.

СТАР. 2

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА**

**объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего НПРУП «Жилкоммунтехника»**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным № 714/С-18712, общей площадью 424 кв. м, наименование: гараж, стоимостью 481 000 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 14.

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным № 714/D-11556, общей площадью 196,5 кв. м, назначение: помещение гостиницы, стоимостью 620 300 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, 15.

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным № 340/D-209717, общей площадью 278,7 кв. м, назначение: помещение неустановленного назначения, стоимостью 1 328 963 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Советская, 37-2.

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным № 340/D-20449, общей площадью 160,1 кв. м, назначение: помещение неустановленного назначения, стоимостью 755 037 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Советская, 37-1.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk. court.by/,**

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 22.03.2012 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться:**

**судебный исполнитель Кобылянский А.С., тел. факс: 294 93 57, 8 (029) 177 32 68; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПЕНТАГОН МОЖА АТАКАВАЦЬ ІРАН «СУПЕРЗБРОЯЙ»

Міністр абароны ЗША Леон Панета папярэдзіў у чацвер, што калі ЗША нанясуць удар па Іране, то ён будзе больш магутны, чым той, які плануе Ізраіль. А ў справаздачы генерал-лейтэнанта амерыканскіх ВПС Герберта Карлайла названа «суперзброя» для паражэння ядзерных аб'ектаў: ??наймагутная бомба вагой у 13,5 тоны, здольная прабіваць бункеры з таўшчынёй бетону ў 65 метраў.

### ЛІТВА СТАЛА ЛІДАРАМ У ЕС ПА РОСЦЕ ВУП

Літва стала лідарам Еўрасаюза па росце ўнутранага валавога прадукту ў апошнім квартале 2011 года. У кастрычніку—снежні 2011 года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2010 года літоўская эканоміка вырасла на 5,4%. Такім чынам Літва заняла па гэтым паказчыку першае месца сярод 27 краін. На 0,1% ад яе адстае Латвія, а трэцяе месца, паводле звестак агенцтва «Еўрастат», займае Польшча (4,3%). Гадавы рост ВУП усіх 27 краін ЕС склаў 0,9%.

### COCA-COLA І PEPSI ПРЫМУСІЛІ ЗМЯНІЦЬ РЭЦЭПТЫ

Coca-Cola і PepsiCo зменяць рэцэпты сваіх напояў, каб пазбегнуць неабходнасці папярэджваць пакупнікоў у штаце Каліфорнія аб наяўнасці канцэрагенаў у прадукце. Улады штата ўнеслі ў спіс канцэрагенаў выяўлены ў кока-коле і пепсі-коле, а таксама ў іх дыетычных варыянтах 4-метылімідазол.





ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГРЭЦЫІ ЎДАЛОСЯ ПАЗБЕГНУЦЬ ДЭФОЛТУ

Урад Грэцыі атрымаў згоду большасці сваіх прыватных крэдытораў на здзелку па абмене даўгавых абавязацельстваў, што дазволіць краіне пазбегнуць дэфолту, перадаюць інфармагенцтвы.



Для таго, каб абмен адбыўся, Афінам неабходна было атрымаць згоду не менш чым 75 працэнтаў крэдытораў. Грэцыі, паводле папярэдняй інфармацыі, удалося атрымаць згоду на здзелку ад 85 працэнтаў прыватных трымальнікаў аблігацый, хоць Афіны і разлічвалі, што атрымаецца абмяняць 90 працэнтаў аблігацый.

Рэструктурызацыя суверэннага доўгу прадугледжвае спісанне інвестарамі 74 працэнтаў укладанняў у грэчаскія даўгі. Дзякуючы найбуйнейшай у гісторыі здзелцы такога роду, дзярждоўг Грэцыі скароціцца больш чым на 100 мільярдаў еўра. Міжнародны валютны фонд і ЕС раней зрабілі дасягненне Афінамі дамоўленасцяў з прыватнымі крэдыторамі абавязковай умовай для атрымання Афінамі 130 млрд еўра фінансавай дапамогі. Грэцыя павінна атрымаць грошы да 20 сакавіка, калі ёй трэба пагасіць аблігацыі на 14,5 мільярда еўра. Цяпер Грэцыя, чый доўг роўны 160 працэнтам ВУП, перажывае найбольш цяжкі эканамічны крызіс з часоў Другой сусветнай вайны.

КОРАТКА

Зацверджаны новы склад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Беларусі. Адпаведны Указ № 125 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 6 сакавіка. Прэзідыум камітэта ўзначаліў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Рубінаў.

Беларусь узнялася з 84-га на 48-е месца (36 пазіцый уверх) у параўнанні з 2008 годам у рэйтынгу ААН па ўзроўні развіцця тэлекамунікацыйнай інфраструктуры.

Права на нарыхтоўку (закупку) вінаградных смаўжоў у Мінскай вобласці выставяць на аўкцыён ва Уздзенскім раёне 12 красавіка. Згодна з заключэннем НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, прамысловы запас вінаградных смаўжоў на Уздзеншчыне складае 3 т, без шкоды для навакольнага асяроддзя тут можна нарыхтоўваць 1,5 т смаўжоў. Пачатковая цана лота складае Br2 млн (сума задатку — Br1 млн), права на нарыхтоўку даецца на тры гады. Аналагічны аўкцыён прайшоў у Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці, дзе за чвэрць гадзіны цана лота паднялася ў пяць разоў з Br1,4 млн да Br7,5 млн. Нарыхтоўку вінаградных смаўжоў выставіў на таргі 3 красавіка і Пастаўскі райвыканкам.

## ЦІ ЗГОДНЫ ВЫ З ТЫМ, КАБ ВА ЎСІХ ГАРАДАХ КРАІНЫ З'ЯВІЛІСЯ ЗОНЫ, СВАБОДНЫЯ АД КУРЭННЯ?



**Зінаіда Мандроўская, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў:**

Гэта вельмі цікавая прапанова. Калі яна наспела ў грамадстве, значыць, мае права на жыццё. Я, вядома, падтрымліваю яе, таму што ўсе мы выдатна ведаем, што курэнне — гэта загана. Прычым гэтая загана ўплывае на здароўе не толькі таго, хто паліць, але яшчэ і навакольных. Цяпер перад грамадствам шмат выклікаў у сувязі са стратай здароўя чалавека. Мы вельмі шмат губляем здаровых маладых людзей у росквіце сіл. Рэзка ўзрасла колькасць анкалагічных захворванняў, тым больш што медыкі звязваюць гэта і з празмерным курэннем. Таму, вядома, такія зоны сталі б першымі «парасткамі», якія маглі б паказаць чалавеку, што можна і трэба не курыць, абараніць сябе і навакольных. І што змагацца з гэтай згубнай звычкай таксама можна, калі ёсць жаданне.



**Леанід Шчамялёў, народны мастак Беларусі:**

— Я ўжо даўно кінуў паліць: не куру з 70-х гадоў і адчуваю сябе нармальна. Думаю, што кожны чалавек, які хоча адчуваць сябе здаровым, павінен задумацца аб тым, каб развітацца з гэтай звычкай — дзеля самога сябе і сваёй сям'і ў першую чаргу, а таксама дзеля іншых людзей. І хачу дадаць, што калі мужчына, які паліць, выглядае ўсё ж неяк больш прывычна, то жанчына і цыгарэта — рэчы несумяшчальныя наогул.



**Аляксей Хлястоў, спявак:**

— Я падтрымліваю гэтую ідэю. Калі мы не палім у грамадскіх месцах, то даём людзям зразумець, што без цыгарэты можна жыць, прычым жыць цікава. Я сам ужо 5 гадоў як кінуў паліць. Хацеў для сябе высветліць, наколькі моцны духам. Было складана, але я змог гэта зрабіць! І праз 8-9 месяцаў адчуў сябе вельмі выдатна — бадзёра, у тонусе. Курэнне — згубная звычка. Я — за здаровы лад жыцця і здаровае грамадства, за здаровыя ўзаемаадносіны.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

■ Надвор'е

## ПАЦЯПЛЕЕ, АДНАК ЧАКАЕЦЦА МОКРЫ СНЕГ З ДАЖДЖОМ І ВЕТРАМ

**Сёння на тэрыторыі Беларусі будзе воблачна з праясненнямі, удзень снег, мокры снег, па захадзе краіны мокры снег з дажджом, паведамілі рэдакцыі ў дзяжурнай службе Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.**

Раніцай і ўдзень туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні, удзень парывісты. Тэмпература паветра ў суботу ад мінус 3 градусаў на паўднёвым усходзе да плюс 6 па паўднёвым захадзе. У Мінску сёння снег, у другой палове дня — мокры снег. Тэмпература ад мінус 1 да плюс 1 градуса. Часам будзе ісці мокры снег і дождж. На захадзе краіны вецер моцны парывісты да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 градусаў на ўсходзе да плюс 3 на захадзе, удзень — ад мінус 2 да плюс 4.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Фінансавы тыдзень

## РУБЕЛЬ ЗРАБІЎ ЖАНЧЫНАМ ПАДАРУНАК

**Беларускі рубель вырашыў зрабіць нашым жанчынам падарунак да галоўнага вясновага свята. Ён прадэманстраваў усю сваю моц: замежныя валюты спасавалі перад такім напорам.**

Нацыянальная валюта ўмацавалася на гэтым тыдні на 60 рублёў адносна «амерыканца» (мінус 0,7%), ажно на 200 рублёў адносна «еўрапейца» (мінус 1,2%) і на 5,5 рубля — адносна «расіяніна» (мінус 2%).

Але падзенне долара і еўра, напэўна, было выклікана не толькі баявым воклічам нашага рубля. У еўразоне канстатуюць новую рэцэсію, а долар слабее з-за росту цэн на нафту. Аднак радуе хаця б тое, што Грэцыя, дзякуючы сваёй нахабнасці, пазбегла дэфолту. Яна пагрозліва зірнула на ўтрымальнікаў аблігацый, якія не хочуць прымаць удзел у рэструктурызацыі яе доўгу. Тыя пабаяліся, што і сапраўды Грэцыя аб'явіць дэфолт і іх паперы абрынуцца. У выніку доля прыватных інвестараў, якія згадзіліся ўдзельнічаць у выратаванні Грэцыі, ужо ў чацвер дасягнула 85%.

Нагадаем, што дзяржаўны доўг Грэцыі перавышае 350 млрд еўра — з такой сумай Афінам не справіцца самім. Акрамя таго, Еўрапейскі Саюз, акрамя Вялікабрытаніі і Чэхіі, падпісаў новы бюджэтны пакт, згодна з якім вызначаюцца новыя жорсткія патрабаванні да дэфіцыту бюджэту (не больш за 0,5% ВУП).

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Спорт

## «СНЕЖНЫ СНАЙПЕР» ШУКАЎ БУДУЧЫХ ЧЭМПІЁНАЎ СВЕТУ

**У Мінску прайшоў фінал спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне, лыжных гонках і стральбе з пнеўматычнай зброі «Снежны снайпер». Будучыя чэмпіёны і чэмпіёнкі свету таксама разыгралі медалі. Традыцыйна гэты турнір арганізоўвае і падтрымлівае Прэзідэнцкі спартыўны клуб.**

Спаборніцтвы завяршыліся лыжнай гонкай на трасе ў сталічным мікраараёне Вяснянка. А за дзень да гэтага юныя спартсмены практыкаваліся ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі, дзе вызначалі не толькі самых трапных, але і фаварытаў перад заключным днём спаборніцтваў. Наступнай раніцай спартсмены змянілі інвентар і выйшлі на трохкіламетровую лыжную гонку. Надвор'е спрыяла і паспяховаму выступленню юных біятланістаў, і добраму настрою балельшчыкаў і ўдзельнікаў.

У малодшай узроставай групе вучаніца наваполацкай гімназіі Аліса Пронічава стала самай хуткай сярод самых трапных і заняла першае месца. Яна Шульжыцкая са Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, якая стала першай у стральбе, саступіла новапалачанцы ўсяго 12 секунд на лыжні. У хлопчыкаў у малодшай узроставай групе галоўны прыз заваяваў Дзмітрый Аляксеенка з Хоцімска Магілёўскай вобласці. Антон Шыдлоўскі з Іўя папоўніў набор узнагарод каманды Гродзенскай вобласці, заваяваўшы «серабро».

У старэйшай узроставай групе Наталля Лісоўская са Шчучына стала двухразовай пераможцай «Снежнага снайпера». Першую перамогу яна святкавала летась, а зараз змагла палепшыць свае вынікі ў кожнай з дысцыплін. Кампанію Наталлі на подыуме склалі Кацярына Макула і Крысціна Загдай. Кацярына родам з Навагрудка і прызы атрымала з рук сваёй зямлячкі, вядомай біятланісткі Людмілы Ананькі. Пераможца сярод хлопцаў у гэтай узроставай катэгорыі — Вадзім Мялько — дарэчы, таксама прадстаўляў Навагрудак.

У камандным заліку перамаглі каманды Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Усе ўдзельнікі турніру, па традыцыі, не засталіся без прызоў і падарункаў ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

**Алена АЎЧЫННІКАВА**

# МІНЭКАНОМІКІ СЁЛЕТА НЕ БАЧЫЦЬ ПАТРЭБЫ Ў АСЛАБЛЕННІ КУРСУ РУБЛЯ



Начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Міністэрства эканомікі Раман БРОДАЎ.

**Скарачэнне ўнутранага попыту ў 2012 годзе будзе працягвацца?**

Што тычыцца гэтага года, то, як паведаміў Раман Бродаў, калі беларускія прадпрыемствы захаваюць свае нішы на замежных рынках у няпростым для сусветнай эканомікі 2012 годзе, праблем з прытокам валюты ў краіну Мінэканомікі не бачыць. Ён таксама адзначыў, што сёлета знешнегандлёвы дысбаланс трэба працягваць скарачаць:

— Калі летась знешнегандлёвы дысбаланс быў скарочаны на 5,8 млрд долараў, то ў гэтым годзе неабходна не толькі замацавацца на пазіцыях 2011 года, але і зрабіць яшчэ адзін крок у памеры 3,1 млрд долараў для таго, каб выйсці ў дыяпазон значэнняў, зацверджаных указам Прэзідэнта.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па яго словах, падмуркам для дасягнення ўстаноўленых параметраў стане працягванне прынятых ў 2011 годзе мер па скарачэнні ўнутранага попыту (падмацаваных адпаведнай грашова-крэдытнай палітыкай) і па пераарыентацыі таварных патокаў на знешні рынак. Дарэчы, па выніках 2011 года за межы краіны было пастаўлена больш за 61% ад аб'ёмаў прамысловай вытворчасці. Пры гэтым ён падкрэсліў, што пры далейшым захаванні трэнду на ўнутраную балансіроўку (а гэта адначасова фундамент і знешняй збалансаванасці) для падтрымання канкурэнтаздольнасці экспарту ў 2012 годзе аслабленне курсу рубля не патрабуецца.

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў Рамана Паўлавіча, як палітыка на скарачэнне ўнутранага попыту адаб'ецца на зарплатах: ці азначае гэта, што заробкі не будуць расці?

— Паняцці ўнутранага попыту і даходаў насельніцтва, безумоўна, карэлірую́ць паміж сабой, але я б не ставіў паміж імі знак роўнасці. Бо попыт на спажывецкія тавары не з'яўляецца адзінай кропкай уздзеяння пры скарачэнні ўнутранага попыту. Дарэчы, спажывецкія тавары ў структуры імпарту займаюць вельмі нязначную частку, таму меры па скарачэнні ўнутранага попыту — гэта галоўным чынам меры, якія не тычацца насельніцтва і зніжэння яго патрэб па набыцці нейкіх тавараў ці павышэння зарплаты. Гэта меры, якія тычацца дзяржаўных выдаткаў, дзяржаўных праграм, дзяржаўных закупак і гэтак далей.

Таксама журналісты ўдакладнілі і наконт курсу беларускага рубля: калі ў аслабленні курсу няма патрэбы, то чаму ў прагнозах і ацэнках на канец 2012 года курс долара закладваецца большы, чым ён усталяваўся зараз?

— Як эканаміст я скажу, што свае выдаткі я заўсёды планую з доляй песімізму, каб знаходзіць тыя значэнні, якія могуць аказацца для мяне крытычнымі, — адказвае Раман Бродаў. — У гэтым выпадку паказчык курсу, пра які вы пытаецце, з'яўляўся разліковым для вызначэння асноўных макраэканамічных паказчыкаў краіны. Гэта не мэтавы паказчык, не дырэктыўны, на яго ніхто не будзе імкнуцца выйсці — ён выкарыстоўваўся проста як разліковы.

**Пры развіцці экспарту на эфект ад дэвальвацыі ўпору не будзе?**

На працягу 2011 года шмат гаварылася, што дэвальвацыйны эфект дапамог некаторым беларускім прадпрыемствам стаць больш канкурэнтаздольнымі на знешніх рынках. Але Раман Бродаў лічыць, што змяненне курсу рубля, безумоўна, паўплывала на экспарт, але гэта быў не самы галоўны фактар.

— Каля 80% прыросту экспарту забяспечана за кошт тавараў, якія маюць невысокую эластычнасць па курсе нацыянальнай валюты. Таму сапраўды, дэвальвацыя аказвала ўздзеянне, але не ў той ступені, каб надаваць гэтаму фактару вялікую значнасць — мы не робім на яго ўпор, калі кажам пра нашы планы па развіцці экспарту, — сказаў Раман Бродаў.

Разам з тым, ён адзначыў, што для экспарцёраў будуць ствараться іншыя стымулы:

— У выніку праведзенай урадам перамоўнай працы ў нас сёлета яшчэ больш выгадныя ўмовы пастаўкі нафты і прыроднага газу. І зніжэнне вартаснага аб'ёму імпарту па гэтых групах ужо само па сабе матэматычна дае неабходны ўзровень сальда знешняга гандлю. Але пры гэтым мы маем намеры ўносіць і кропкавыя прапановы, якія будуць падтрымліваць экспарцёраў — як у частцы спрашчэння заканадаўства, так і ў частцы стварэння стымулаў, якія будуць спрыяць дзейнасці на знешніх рынках. Асаблівую ўвагу мы мяркуем сканцэнтраваць на інстытуце знешняга экспартнага крэдытавання. Мы перакананыя, што пры значным патэнцыяле яго існуючая эфектыўнасць вельмі нізкая.

Што тычыцца першых месяцаў 2012 года, то Раман Паўлавіч вельмі асцярожна каментуе вынікі знешнеэканамічнай дзейнасці за гэты час: маўляў, недастаткова матэрыялу для аналізу і фундаментальных высноў. Ён адзначыў, што студзень, як правіла, з'яўляецца месяцам нетыповым, але, тым не менш станоўчае сальда па выніках студзеня гэтага года Мінэканомікі прагназавала (паводле інфармацыі Белстата, яно склала 126,1 млн долараў. — **Аўт.**). Што тычыцца лютага, то ў ім тэндэнцыі павінны працягвацца:

— Я дам асцярожную ацэнку: тэндэнцыі студзеня, як мы чакаем, захаваюцца і ў лютым. Гэта значыць, што станоўчы стан знешнегандлёвага балансу ў лютым таксама будзе захаваны, — адзначыў Раман Бродаў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

■ Дэмаграфія

# ЖУРНАЛІСТАЎ ЗАКЛІКАЛІ ДАЛУЧЫЦЦА ДА АРМІІ ЖЫЦЦЯ

**Беларускім саюзам журналістаў сумесна з аргкамітэтам Рэспубліканскай духоўна-асветніцкай праграмы «Сям'я — Яднанне — Айчына» на базе Дома праваслаўнай кнігі праведзены семінар па праблемах дэмаграфічнай бяспекі і абмеркаванні праекта «Мемарандума грамадскай згоды журналістаў СМІ, прадстаўнікоў творчых саюзаў пра падтрымку і абарону сямейных каштоўнасцяў».**

— Мы ў сваім служэнні слову павінны асабліва вылучаць тэму дэмаграфічнай бяспекі, высокіх маральных ідэалаў і Бацькаўшчыны, — адзначыла **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ**. — Беларусаў павінна быць больш — такую задачу трэба ставіць пры напісанні артыкулаў і сцэнарыяў. На гэтым цудоўным кавалку зямлі хопіць месца, святла, працы, радасці ўсім. Міністэрства інфармацыі будзе і далей надаваць увагу гэтай тэматыцы.

Падобны Мемарандум быў падпісаны расійскімі журналістамі пяць гадоў таму, аднак яго падпісанне, нягледзячы на тое, што дакумент не мае юрыдычнай сілы, адбывалася няпроста. Частка рэгіянальных тэлерадыёкампаній Расійскай Федэрацыі, унутрана падтрымліваючы ідэі сацыяльнай адказнасці СМІ за духоўна-маральны стан грамадства, адмовіліся падпісваць Мемарандум з-за таго, што яны не ў стане паўплываць на эфірную палітыку сваіх сеткавых партнёраў, размешчаных у Маскве.

«Адмова ад падпісання Мемарандума прадстаўнікамі некаторых СМІ дазволіла вызначыць тыя з іх, якія ва ўгоду камерцыйным інтарэсам не маюць намер адмаўляцца ад антыграмадскай інфармацыйнай палітыкі, — лічаць арганізатары семінара ў Мінску. — Такое размежаванне дазволіла грамадскасці і журналісцкай супольнасці ўжыць розныя меры ўздзеяння на тых, хто свядома працягвае разбуральна ўплываць на маральнасць суайчыннікаў, асабліва на моладзь, ствараючы патэнцыйную пагрозу будучым пакаленням. У выніку падпісанне Мемарандума прадстаўнікамі СМІ рэалізавалася як адзін са спосабаў павышэння адказнасці журналістыкі перад грамадствам».

— Мемарандум не мае юрыдычнай сілы, але мае маральную, — падкрэсліў **старшыня ўпраўлення Міжнароднага дабрачыннага фонду «Сям'я — Яднанне — Айчына», выканаўчы дырэктар Выдавецтва Беларускай праваслаўнай царквы Уладзімір ГРОЗАЎ**. — Журналісты, якія падпісалі гэты дакумент (такіх сёння каля 1000), па сутнасці, расстаўляюць свае прыярытэты і ўскладаюць на сябе грамадзянскую і маральную адказнасць перад грамадствам за вынікі сваёй прафесійнай дзейнасці... Расіяне зрабілі той самы крок, які ў канчатковым выніку павінен прывесці грамадства да цывілізаванага вяшчання, да ўсведамлення сям'і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства — як найвялікіх каштоўнасцяў чалавецтва. А мы маглі б не толькі далучыцца да іх ініцыятывы, але, магчыма, і развіць яе!

На семінары, які праходзіў у атмасферы творчай вечарыны, створанай **паэтам і кампазітарам Вячаславам БАБКОВЫМ** і Камерным духоўным тэатрам фонду «Сям'я — Яднанне — Айчына», размова ішла і пра дэмаграфічны крызіс, наступствы абортаў, пагрозу, якая хаваецца ў заходняй мадэлі ювенальнай юстыцыі, тэму моладзевых суіцыдаў і сямейных каштоўнасцяў. І, вядома, пра тое, якую ролю ва ўсім гэтым адыгрывае прэса.

**Старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль ЛЕМЯШОНАК** паабяцаў, што падобныя сустрэчы-семінары будуць адбывацца не толькі ў сталіцы, але і, часцей за ўсё, у глыбінцы, каб ахапіць як мага большую колькасць прадстаўнікоў СМІ і грамадскіх арганізацый.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

НАВІНЫ

## ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ НА 53,9 МЛН ДОЛАРАЎ

Паводле папярэдняй інфармацыі, аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі ў вызначэнні спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ на 1 сакавіка 2012 года склаў 8035,1 млн долараў ЗША. Атрымліваецца, што па выніках лютага рэзервы павялічыліся на 53,9 млн долараў.

У нацыянальным жа вызначэнні павелічэнне склала 78,2 млн долараў, а рэзервы сталі роўныя 9584,7 млн долараў ЗША. Рост фінансавых запасаў краіны выклікалі цэны на золата, якія на міжнародным рынку каштоўных металаў выраслі. Таксама таму паспрыяла сальда куплі-продажу Нацыянальным банкам замежнай валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## НАЧНЫ ЧАС — ДЛЯ ПАЎНАЛЕТНІХ

У выхадныя супрацоўнікі міліцыі грамадскай бяспекі ў кругласутачным рэжыме будуць правяраць забаўляльныя ўстановы, якія працуюць у начны час. Пры выяўленні фактаў допуску ў начны час у клубы і на дыскатэкі непаўналетніх, юрыдычных асоб і бацькоў падлеткаў чакае адміністрацыйная адказнасць.

Як паведамляюць ва ўпраўленні аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Мінаблвыканкама, у сувязі з ростам на тэрыторыі Мінскай вобласці колькасці злачынстваў, учыненых падлеткамі, органы і падраздзяленні міліцыі Міншчыны прымаюць у святочныя дні шэраг дадатковых прафілактычных мер.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

ПАДЗЕІ

## ПАЖАР У ШКОЛЕ: ПАЦЯРПЕЛЫХ МАГЛО НЕ БЫЦЬ?

З-за пажару ў Расонскай сярэдняй школе імя Машэрава, які адбыўся 7 сакавіка каля васьмі гадзін раніцы, вучні старэйшых класаў атрымалі траўмы.

Як паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, ужо праз некалькі хвілін да школы прыехалі чатыры падраздзяленні МНС.



Эвакуіравалі, у тым ліку і з выкарыстаннем лесвіц, каля 610 дзяцей і выкладчыкаў. Дзякуючы гэтаму ў выніку пажару пацярпелых ад апёкаў ці атручвання ўгарным газам не было. Але з-за таго, што яшчэ да прыезду выратавальнікаў некаторыя школьнікі, спалохаўшыся моцнага задымлення, скакалі з вокнаў, сямёра з іх атрымалі ўдары і пераломы (пра гэта паведамілі ў Расонскай цэнтральнай раённай бальніцы). На дапамогу мясцовым медыкам прыбылі траўматолагі з Віцебска, пацярпелых гатовы былі пры неабходнасці перавесці ў абласны цэнтр для далейшага лячэння. Спецыялісты аказалі падлеткам псіхалагічную дапамогу.

Трохпавярховы будынак школы не пашкоджаны. Прычынай узгарання, паводле папярэдняй інфармацыі, стала неасцярожнае абыходжанне з агнём, у выніку чаго загарэлася макулатура. Дарэчы, адкрытым застаецца пытанне: чаму макулатура знаходзілася пад лесвіцай?.. Як і такое: дзе яе захоўваць перад здачай на нарыхтоўчы пункт?

Адразу пасля таго, як стала вядома пра надзвычайнае здарэнне, у райцэнтр выязджаў губернатар Віцебшчыны Аляксандр Косінец. Ён на месцы азнаёміўся з сітуацыяй і даў адпаведныя ўказанні.

Супрацоўнікі Следчага камітэта абласнога і раённага ўзроўняў праводзяць неабходную працу. Абавязкова будзе высветлена, чаму ў школе, дзе планава адпрацоўваюцца мерапрыемствы на выпадак узнікнення надзвычайных здарэнняў, пацярпелі дзеці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ФАКТЫ

## ЖАНЧЫНА ПАСЛЯ ДТЗ КІНУЛА СЯБРОЎКУ, ЯКАЯ ПАМІРАЛА

У Мінску ў ноч з 8 на 9 сакавіка пасля ДТЗ жанчына-кіроўца ўцякла з месца здарэння, пакінуўшы ў разбітым аўтамабілі пасажырку ў цяжкім стане, паведамілі ў ДАІ РУУС Фрунзенскага раёна.

9 сакавіка ў 01.50 на вул. Матусевіча ў аўтамабілі «Мазда 626», які рухаўся ў бок вуліцы П. Глебкі, знаходзіліся дзве жанчыны 1974 і 1975 гадоў нараджэння. Кіроўца не справілася з кіраваннем і ўчыніла наезд на асвятляльную мачту. У выніку сутыкнення ў аўтамабіля адарвала багажнік да сярэдзіны салона (аўтамабіль аднаўленню не падлягае). Жанчына-кіроўца ў шокавым стане ўцякла з месца здарэння. Яе сяброўка, якая знаходзілася ў салоне ў цяжкім стане, дастаўлена ў бальніцу хуткай дапамогі. Папярэдні дыягназ — чэрапна-мазгавая траўма і шматлікія пераломы рэбраў. Асоба жанчыны, якая знаходзілася за рулём, высветлена па дакументах, пакінутых у салоне, вядзецца яе вышук. Улічваючы цяжкасць аварыі, у ДАІ не выключаюць, што тая, якую шукаюць, звернецца па медыцынскую дапамогу.

**Кар. БЕЛТА.**


**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» – продавец (организатор аукциона) 03 апреля 2012 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Лодка металлическая | 8 446 860 | г. Могилев, Славгородское шоссе, 170 | 845 000 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 23 64 24, 28 41 00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 03.04.2012 г. в 11-00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012119241011 в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк» код 369, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 02.04.2012 г.; время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано в газете «Звязда» № 29 от 14.02.2012 г.



**Предложение о покупке акций ОАО «Центроэнергомонтаж»**

| | |
|---|---|
| Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица) | Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж» |
| Место жительства (местонахождение для юридического лица) | 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7 |
| Наименование и местонахождение эмитента | Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7 |
| Цель приобретения акций | Для последующей продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом акционерного общества |
| Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук) | 20 000 |
| Цена приобретения (белорусские рубли) | 81 500 |
| Сроки, форма и порядок расчета | Оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций. |
| Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций | г. Минск, переулок Велосипедный, д.7 с пометкой «Совет директоров. Предложение о покупке акций» |
| Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций | с 12 марта 2012 года по 24 мая 2012 года |
| Даты начала и окончания покупки акций | с 28 мая 2012 года по 31 мая 2012 года |



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**на 7-секционный 12-16-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (3-й пусковой комплекс – Блок Б) по генплану №4 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по пр. Дзержинского в г. Минске**

**Информация о застройщике:** Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Синтез-Белнеп Строй», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 04 декабря 2003 года №2057 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190501210.

Адрес: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18. Режим работы: Пн.-Пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Телефон: (017) 246 48 89, Факс: (017) 246 44 47.

До настоящего проекта организация осуществляла функции заказчика на 9-секционный 11-19-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс – Блок А) по генплану №1 и 25-этажный односекционный многоквартирный жилой дом (2-й пусковой комплекс – Блок Г) по генплану №2 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» в г. Минске.

**Информация о проекте строительства:**

Цель проекта строительства – строительство 7-секционного 12-16-этажного многоквартирного жилого дома со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (3-й пусковой комплекс – Блок Б) по генплану №4.

Здание многоквартирного жилого дома запроектировано из 7 секций, общая площадь жилого здания 42636 м$^2$. Количество жилых помещений (квартир) – 438, из них: однокомнатных – 108 двухкомнатных – 142, трехкомнатных – 133, четырехкомнатных – 43, пятикомнатных – 12. Каждая секция оборудована мусоропроводом, двумя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (балконы и лоджии). В 2-, 3-, 4-, 5-комнатных квартирах ванные комнаты с естественным освещением. Конструкция здания – каркасно-монолитное сооружение. На 1-м этаже здания расположены встроенные помещения общественного и административного назначения общей площадью 2842,536 м$^2$. В зоне верхнего технического этажа – мастерские творческих организаций, общей площадью 1331,76 м$^2$. Количество машино-мест подземной гараж-стоянки – 100.

Многоквартирный жилой дом расположен по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, д. 127.

Начало строительства – ноябрь 2011.

Окончание строительства – июнь 2013.

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:

– государственную экспертизу (заключение РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» от 06.09.2007 №1979-07 с дополнениями к заключению от 03.01.2011 №1781-15/10).

– государственную экологическую экспертизу (заключение №158 от 11.06.2007).

Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску выдано разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-015/08 от 31.03.2011 г.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 10,8623 га решениями Минского горисполкома от 15 ноября 2007 года №2679, от 03.03.2011 №516. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Свидетельства (удостоверения) №500/141-3252 от 10.01.2008, №500/141-3247 от 10.01.2008, №500/141-3248 от 10.01.2008, №500/141-3251 от 10.01.2008, №500/141-3250 от 10.01.2008, №500/1028-2025 от 11.05.2010 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

**Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается к заключению договора создания объекта долевого строительства 22 (двадцать две) квартиры:**

– однокомнатные – 6 (шесть) квартир общей площадью ( 40,33-53,64 ) м$^2$. Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.03.2012 г.) составляет 8 170 000 (восемь миллионов сто семьдесят тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 1000 (тысяча) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

– двухкомнатных – 6 (шесть) квартир общей площадью (70,45 ) м$^2$. Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.03.2012 г.) составляет 7 924 900 (семь миллионов девятьсот двадцать четыре тысячи девятьсот) бел. рублей, что эквивалентно 970 (девятьсот семьдесят) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

– трехкомнатные – 8 (восемь) квартир общей площадью ( 90,99-96,48) м$^2$ Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.03.2012 г.) составляет 7 761 500 (семь миллионов семьсот шестьдесят одна тысяча пятьсот) бел. рублей, что эквивалентно 950 (девятьсот пятьдесят) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

– четырехкомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью (113,82) м$^2$. Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.03.2012 г.) составляет 7 598 100 (семь миллионов пятьсот девяносто восемь тысяч сто) бел. рублей, что эквивалентно 930 (девятьсот тридцать) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

– пятикомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью (140,92) м$^2$. Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.03.2012 г.) составляет 7 353 000 (семь миллионов триста пятьдесят три тысячи) бел. рублей, что эквивалентно 900 (девятьсот) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Отделка квартир не выполняется. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находится в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи (за исключением, находящихся в них творческих мастерских и иных нежилых помещений общественного назначения) и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство парковки.

**Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства в эксплуатацию — июнь 2013 года.**

Строительство многоквартирного жилого дома ведется ООО «Буд М».

Срок действия настоящей проектной декларации – по 17 мая 2012 г.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18, или по телефону: (017) 246 47 43; 246 48 89, 611 33 33 (velcom), на сайте www.dolevoe.by.



**ОАО «Лидапищеконцентраты»** сообщает: в повестку дня общего собрания акционеров, которое состоится **14 марта 2012 года,** вносятся изменения и дополнительно включены вопросы:

Повестка дня:

1. Об увеличении Уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
3. Об утверждении решения о выпуске акций Общества.

*УНП 500021268*

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 9 (138)

■ Дзеля памяці

# КАЗКІ НЕ ДЛЯ ГАРАВАННЯ

**Дабро перамагае зло, нават калі напрыканцы хочацца паставіць пытальнік. У жыцці паэта Алеся Гаруна такіх пытальнікаў мы можам угледзець шмат, пры тым, што яго шлях не быў доўгім. Але дзеля дабра на радзіме ён гатовы быў здароўе аддаць, а то і само жыццё...**

Не, гэта не прыгожыя словы: жыццём ахвяравалі на пачатку мінулага стагоддзя, калі яшчэ не было Беларусі, але ўжо была мара пра яе. Адзін з тых, хто не шкадаваў сябе дзеля радзімы, — Алесь Гарун, паэт, публіцыст і палітык. 11 сакавіка адзначаецца яго 125-годдзе.

...У сям'і мінскіх рамеснікаў Прушынскіх нараджаецца хлопчык, якога з дзяцінства вучылі чытаць па-польску і па-руску. І толькі ўжо ў свядомым узросце малады чалавек раптам адчувае смак беларускага слова: дзякуючы аповесці Дуніна-Марцінкевіча «Гапон». Але і сам пачаў пісаць і друкавацца: «нашаніўская» пара стала для яго момантам саспявання як грамадзяніна, які марыў быць абаронцам роднай зямлі і яе народа. Як Купала ці Багдановіч, з якімі ён пачаў рабіць адну справу. Яму яна каштавала зняволення ў турмах Мінска, Вільні і высылкі ў Сібір. Але там адбылося нараджэнне паэта з зусім невыпадковым псеўданімам — Гарун. Зборнік «Матчын дар» нарадзіўся далёка ад Беларусі, але быў перасланы для выдання Віленскаму выдавецкаму таварыству. І выйшаў вельмі своечасова...

Былі надзеі на рэвалюцыю. У нейкім сэнсе спраўдзіліся: было вяртанне ў Беларусь. Тое, што спазнаў паэт за гады высылкі, не магло пакінуць яго ў баку ад грамадскіх працэсаў. Былі думкі пра тое, што новы парадак дасць магчымасць яго народу атрымаць права на сваю дзяржаву. Гэта стала важней за ўласнае здароўе, якое вельмі падарвала праца ў Сібіры. Але загартаваны, мэтанакіраваны і па-беларуску ўпарты, ён жыве дзеля ідэі тры апошнія гады свайго жыцця. Штосьці паспявае засведчыць: у 17-м стаў віцэ-старшынёй Усебеларускага з'езда. Пра штосьці паспявае сказаць людзям: праз свае «Жывыя казкі»...

Сёння мы прапануем некалькі вершаў Алеся Гаруна — як успамін пра паэта.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■



**Алесь Гарун**

### ЭЛЕГІЯ

*Жыццё — гасцінец,*
*гады — як вёрсты,*
*Канец жыццёвы — то небаспад.*
*Ідзеш паволі, што далей — болей*
*Тых вёрст жыццёвых цячэць назад.*
*Што далей — болей...*
*Сціха, паволі*
*Старэеш, слабнеш, цяжэеш ты,*
*Аж ўрэшце ледзьве нагі абедзве*
*Дацягнеш неяк да тэй вярсты,*
*Дзе гэным знакам,*
*што ўсім аднакаў,*
*Ці хто ялмужнік, ці хто купец,*
*На страх выразна, для ўсіх паказна*
*Стаіць: «Спыніся, вось твой канец!»*

### ІДУЦЬ ГАДЫ

*Ідуць сабе гады, ідуць,*
*Бы карагод, бясконца,*
*Што ў небе зорачкі вядуць*
*Ля месяца, ля сонца.*
*Ідуць сабе гады, ідуць —*
*І чалавек за імі.*
*Куды цябе яны вядуць*
*І сцежкамі якімі?*

*«Няведама мне, скуль усё і што я;*
*Няведама мне сама сцежка мая,*
*Няведама мне, і куды я іду.*
*Пытання не маю, ці што там знайду,*
*Ня ведаю жыццё, ці шчасце, ці не, —*
*Пачалося гэта, браток, не на мне».*

*Ідуць гады, ідуць гады,*
*І з імі ўсё на свеце.*
*Сягоння ты, а йшлі дзяды,*
*А заўтра пойдуць дзеці.*
*Ідуць гады, і ты ідзеш*
*Ўздагонь за імі, з імі.*
*Нашто, скажы мне, ты жывеш*
*І з думкамі якімі?*

*«З аднэю я думкай у свеце жыву,*
*Настаўнікам ўзяўшы і лес і траву,*
*Крыніцы, і кветкі, і цемру, і свет,*
*І месяц, і зоры, і сонца прывет.*
*Прысуджаны шлях свой*
*рабі дарагім,*
*Красуйся на радасць сябе*
*і другім».*

### ПАЭТУ

*Што кажаш мне, паэт,*
*а праўдзе тэй, што будзе?*
*Мне сэрца кроіцца*
*ад крыўды нашых дзён!*
*А бачу добра й сам:*
*ідуць да праўды людзі,*
*Расцець яе жаўнер,*
*і шырыцца загон*
*Марудна, братачка!*
*І покуль сонца ўзыдзе,*
*Дык вочы выесць нам*
*салёная раса,*
*І покуль першы дзень людскога*
*шчасця прыйдзе,*
*Мільёны сэрц праткне*
*гароты злой каса.*

*Пакінь, пакінь спяваць*
*а праўдзе тэй, што ў небе!*
*Яна чужая нам,*
*таемных праўда сіл;*
*Яна не сходзіць к нам*
*ў канечнае патрэбе,*
*Калі пакуты дзень*
*так довег і не міл!*

*Прашу цябе, мой брат,*
*спявай аб нашым горы,*
*Аб тым, што ёсць цяпер*
*і што даўней было,*
*І што на ўсякі твар кладзецць,*
*як плуг, разоры,*
*І што ў мільёнах душ*
*разоры правяло.*
*Прашу цябе, спявай аб горы*
*песнь адну ты*
*І наш гаротны лёс рабі яшчэ*
*цяжэй,*
*Тагды, убачыш сам,*
*парвуцца духа путы*
*І будзе ясны дзень*
*да нас тагды бліжэй.*

### ВЯСНА

*Эх, вясна, вясна!..*
*Як прыйшла яна,*
*Прынясла святла,*
*Прынясла цяпла,*
*Наліла ў лагох*
*Снегавой вады,*
*Расцвіла ў лугох,*
*Распляла сады,*
*Прабудзіўся лес*
*На вясенні шум,*
*А глыбокі сум*
*Мне ў душу улез...*
*Першыя гусі ужо праляцелі,*
*Палі на рэчцы, узгорак абселі,*
*Гвагалі доўга, нараду сабраўшы,*
*Потым згадзіліся,*
*дось пакрычаўшы,*
*Ўзляцелі высока над сосны, над елі*
*І недзе прапалі ў нябескім касцелі...*
*Ах, каб крылля, крылля мне*
*І той лёт гусачы,*
*Я прапаў бы ў гарыне,*
*Хто б мяне і бачыў!*
*Раз у пораз, раз у раз*
*Ў неба б біў крыламі...*
*Гусі, гусі, я да вас,*
*Я лячу за вамі!*
*Дзе былі вы? Што было там?*
*Дзе жылі вы? Над балотам?*
*Мо ля рэчкі? Мо ля хаткі?*
*Ля сялібы майго таткі?*
*Мае маткі, майго браткі*
*Вы не бачылі часамі?*
*А сястрыцы? А дзявіцы,*
*Маёй любы,*
*Вы не бачылі часамі?*
*А у шлюбы*
*Не збіраецца сястрыца?*
*Не? А люба, чараўніца?..*
*Ці там ймгліста,*
*Ці там ясна?*
*Красна? Міла?*
*Гусі! Шчасна?..*

# Радзівілы «спыніліся» ў Віцебску

**У Віцебскай абласной бібліятэцы напярэдадні жаночага свята адкрылася выстава акварэльных партрэтаў вядомых беларускіх жанчын мінулых стагоддзяў. Сярод гістарычных персаналій (як сёння б сказалі, «свецкіх львіц») — Людвіка Караліна Радзівіл, Барбара Радзівіл, Францішка Уршуля Радзівіл і не толькі яны, а, напрыклад, і біблейскія гераіні — Ева, Юдзіф...**



Аўтар гэтых твораў — вядомы віцебскі акварэліст Міхась Ляўковіч. Ён доўгі час узначальваў суполку «Віцебская акварэль». Працуе старшым выкладчыкам жывапісу, малюнка і кампазіцыі на кафедры выяўленчага мастацтва славутага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. Машэрава. Цікава, што вядомы мастак не здолеў з першай спробы паступіць на мастацка-графічны факультэт, дзе доўгі час выкладае. Пайшоў у армію і толькі потым паспяхова «ўзяў» ВНУ (на той час — педагагічны інстытут імя Кірава). Творчы шлях майстар пачынаў як акварэліст. Удзельнічаў у розных прэстыжных конкурсах. У 1991 годзе Міхась Ляўковіч атрымаў першую прэмію па акварэлі ў конкурсе сярод мастакоў, пераможцаў якога выбіралі мастацтвазнаўцы з Траццякоўскай галерэі.

Між іншым, свае работы ён традыцыйна падпісвае па-беларуску. Міхаіл Васільевіч Ляўковіч, нягледзячы на немалады ўзрост, поўны сіл і планаў. Ён пастаянны ўдзельнік выстаў у розных гарадах краіны і за мяжой. Яго творы былі прадстаўлены ў Турцыі, Італіі, Іспаніі, Францыі, Германіі, Польшчы, Літве, Латвіі, Расіі і ЗША... І, безумоўна, у родным Віцебску, іншых гарадах Беларусі перыядычна праходзяць персанальныя выставы яго работ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «Тэатральная вясна» Купалы і Коласа

**Абласное свята «Тэатральная вясна-2012», прысвечанае 130-годдзю з дня нараджэння Купалы і Коласа, пройдзе ў Наваполацку.**

Як паведаміла **Валянціна КІШЧАНКА, начальнік аддзела культуры Наваполацкага гарвыканкама**, у фэсце возьмуць удзел больш за дзесяць самадзейных тэатральных калектываў з розных рэгіёнаў Віцебшчыны. Цікава, што толькі ў Наваполацку сёння дзейнічаюць ажно чатыры тэатры. Гэта — заслужаны аматарскі калектыў «Арт» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, народны тэатр гарадскога Палаца культуры «Час», тэатр гімназіі №2, а таксама батлеечны, які дзейнічае пры цэнтры народных рамёстваў.

Як падкрэсліваюць арганізатары фестывалю, няма мэты вызначаць «мацнейшыя» непрафесійныя тэатры. Галоўнае — прадставіць творчыя дасягненні самадзейных калектываў, выклікаць інтарэс у гледачоў да беларускай літаратуры і нацыянальнага тэатральнага мастацтва. Фестываль пройдзе 30-31 сакавіка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Ведай нашых!

# СКАРЫЦЕЛЬНІЦА АЛІМПУ

**Запомніце гэтае імя: Паліна Русецкая. Салістка Беларускага балета. Беларускі харэаграфічны каледж дзяўчына скончыла амаль два гады таму, але ўжо праз год стала салісткай. І вось цяпер новая вышыня: Паліна Русецкая заваявала залаты медаль міжнароднага конкурсу «Танцавальны алімп», што праходзіць у Берліне.**

Конкурс сёлета сабраў удзельнікаў з 35 краін свету. Усяго ў ім спаборнічалі каля 1000 артыстаў. Дагэтуль у конкурсе таксама ўдзельнічалі артысты з Беларусі і былі адзначаны. Але тут галоўнае нават не перамога, не медаль сам па сабе. А тое, што за ім стаіць ці будзе стаяць: адчуўшы аднойчы «водар» творчых спаборніцтваў, пабачыўшы ўзровень артыстаў розных краін, малады артыст захоча расці далей. Тым больш што на конкурсе ёсць на каго паглядзець, ёсць да чыіх парад прыслухацца. У журы «Танцавальнага алімпу» ўваходзяць асобы вельмі вядомыя ў балетным свеце: народны артыст СССР Уладзімір Васільеў, народны артыст Расіі Сяргей Філін (узначальвае балетную трупу Вялікага тэатра), Эліза Карыа Кабрэра, прыма-балерына Берлінскай дзяржаўнай оперы, Уладзімір Малахаў, кіраўнік балетнай трупы Берлінскай дзяржаўнай оперы, ды іншыя. Скарыць такое журы не проста. Але дзяўчыне з Беларусі Паліне Русецкай гэта ўдалося дзякуючы выкананню варыяцыі скарыцельніцы дрыяд.

**— Высокая адзнака на міжнародным конкурсе сведчыць пра тое, што ў вас добрая школа. У каго вы вучыліся?**

— Я скончыла наш харэаграфічны каледж (клас Марыны Уладзіміраўны Пятровай), вучылася ў народнай артысткі Ірыны Мікалаеўны Савельевай. Калі я патрапіла ў тэатр, то цэлы год танцавала ў кардэбалеце, потым перавялі ў салісткі. Спачатку давалі партыі выконваць, каб паглядзець, як я спраўляюся. Напрыклад, у балеце «Жызэль»... Мне далі станцаваць значныя партыі і пасля перавялі на салістку.

**— Вы самі выбіралі, што танцаваць на конкурсе? Ці былі кансультанты, якія падказвалі, што трэба паказваць?**

— Па-першае, хацелася ехаць на конкурс, каб нейкую асабістую «фішку» паказаць — тое, што мяне вылучае. Варыяцыі з «Дон Кіхота» давалі мне магчымасць паказаць скачок. «Дон Кіхот» я ўжо танцавала на нашай сцэне, так што ехала з адпрацаванымі партыямі. У гала-канцэрце танцавала партыю з балета «Пахіта».

**— Канкурэнцыя была сур'ёзная сярод салістаў?**

— Удзельнікі былі моцныя, асабліва вылучаліся са Швейцарыі, Карэі, Амерыкі, Партугаліі.

**— Прынята лічыць рускую школу балета моцнай.**

— Але зараз у балетным свеце ўсё мяняецца. Моцнымі артыстамі бываюць прадстаўлены азіяцкія краіны: Карэя, Кітай, Японія. Калі ўдзельнікі адтуль прыязджаюць на конкурсы, то амаль заўсёды бяруць залатыя медалі.

**— Якія магчымасці гэты залаты медаль асабіста вам адкрывае? Прапановы, магчыма, ужо атрымлівалі?**

— Безумоўна, былі запрашэнні. Але для мяне гэта першая прыступка, першы конкурс. Не была ўпэўнена, што з першага конкурсу мяне адразу заўважаць, ацэняць. Прыемна, вядома. Але пакуль я не строю ніякіх планаў і нікуды не збіраюся. У нас у тэатры я вучуся, працую. Думаю заставацца тут. Спадзяюся, што ўдасца яшчэ ў нейкіх конкурсах паўдзельнічаць, прадстаўляючы Беларусь.

**— Ці была магчымасць наведаць майстар-класы падчас конкурсу, каб зразумець, куды далей расці?**

— Паколькі гэта першы мой конкурс, то я імкнулася як мага больш на ім зразумець, спазнаць. Было вельмі цікава наведваць майстар-класы зорак балета. Усё гэта для мяне было новае, цікавае. У тым ліку майстар-клас Уладзіміра Малахава, які кіруе балетам у Берлінскім тэатры. Таксама я была на майстар-класе Жызэлы Роха, але гэта зусім іншы танец, сучасны. Так, да мяне падыходзілі члены журы, вельмі добра адгукаліся, гэта мяне падтрымлівала.

**— Вы аддаяце перавагу класічнай харэаграфіі? Ці ёсць жаданне пошуку, эксперыменту?**

— У першую чаргу для мяне важны класічны балет. Але цікава спрабаваць нешта новае. Зараз у нас у тэатры спрабуюць ставіць балеты ў напрамку мадэрн. Вядуцца рэпетыцыі. Я таксама ўдзельнічаю ў гэтых пастаноўках. Для мяне вельмі цікава паспрабаваць і такі балет, таму што ва ўсіх тэатрах свету мадэрн займае да 50 працэнтаў рэпертуару.

**— Ці ёсць нейкая партыя, у якой вы танцуеце і думаеце: «Гэта я»?**

— Пакуль я працую яшчэ не так даўно, значных партый мне не давалі станцаваць. Спадзяюся, што ўсё наперадзе. А калі думаць, які вобраз мне бліжэй, магчыма, гэта вясёлая, завадная, задорная дзяўчына Ману з балета «Баядэрка». Мне бліжэй вясёлыя вобразы, шчырыя партыі.

**— Ці ёсць у вас сябры і ці хапае часу на нешта іншае, акрамя балета?**

— Так, сябры ёсць. На сустрэчы часу хапае. І на тое, каб мову вучыць і на правы здаваць...



**— У балет звычайна дзяцей прыводзяць бацькі, з самага маленства. Напэўна, са спадзяваннямі і надзеямі. Да вас дома ўжо ставяцца як да зоркі?**

— Як да зоркі?.. Такога няма. Акрамя мяне, у сям'і яшчэ два браты, у бацькоў клопату хапае. Мае бацькі не звязаны з творчымі прафесіямі. Але ў балет я сапраўды трапіла дзякуючы маме. З чатырох гадоў я займалася мастацкай гімнастыкай. Да нас у дзіцячы садок прыйшоў трэнер, адабраў здольных дзяцей, я аказалася ў іх ліку. Займалася мастацкай гімнастыкай, а потым мама даведалася пра харэаграфічны каледж, вырашыла мяне аддаць туды. Я спачатку не хацела, супраціўлялася. А потым мне гэта спадабалася. Родныя вельмі ганарацца, ім цікава назіраць, як я развіваюся.

**— Але балет — від заняткаў, які патрабуе поўнай аддачы, што звязана з напружаннем, траўмамі, болем. Няўжо не было такога, што мама, гледзячы на вас, сказала: «Усё, кідай...»**

— Былі і траўмы, і боль, і слёзы... Але мне ніколі такога не казалі. Родныя мяне падтрымліваюць. Пры гэтым мне было дадзена права выбару: калі ты хочаш... калі табе падабаецца... калі ты гатова да складанасцяў... Мама з татам заўсёды пачыналі мяне хваліць, каб падтрымаць. Так, права выбару ў мяне было, але я сама не выказвала жадання сысці, пераадольвала сябе. І ішла далей.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

# Патрэбна стварыць свайго чытача

**Што такое літаратура?.. Спорт? Кавалак мыла? Медычная энцыклапедыя?.. Магчыма, усё адразу. Можа быць, вы не пагодзіцеся з гэтым. Але тое, што літаратура — гэта гульня, напэўна, ужо вядома кожнаму носьбіту сучаснай постмадэрнісцкай свядомасці. І з гэтай гульнёй беларускія літаратары спраўляюцца выдатна.**



Калі літаратурны працэс у заняпадзе, яго спрабуюць рэабілітаваць. Дапамагчы літаратуры ўстаць на ногі, паверыць у сябе, вярнуць аб'ектыўнасць і свежасць успрымання. Сутаргава пачынаюць шукаць новыя імёны. У Беларусі складана разабрацца, што каго стымулюе. Або літаратурны працэс стымулюе з'яўленне новых літаратурных прэмій. Або новыя літаратурныя прэміі ствараюцца дзеля таго, каб стымуляваць літаратурны працэс... Магчыма, усё адразу. Але літаратурныя прэміі і разнастайныя конкурсы ствараюць атмасферу здаровай творчай канкурэнцыі. А канкурэнцыя, як вядома, адзін з рухавікоў прагрэсу. Для таго, каб у нашай літаратуры захавалася і свежасць успрымання, і не спыняўся прыток новых аўтараў, канкурэнцыю варта падтрымліваць. І такім чынам заахвочваць да плённай творчасці літаратараў. Нездарма пісьменніца Людміла Рублеўская любіць адзначаць, што «твор мастацтва заўжды ствараецца на тэрыторыі ўласнай свабоды аўтара»...

Цікавыя тэндэнцыі назіраюцца сёння ў літаратуры. Здаецца, з-за таго, што пра ўсё на свеце ўжо напісана, кожны літаратар піша сам пра сябе. Яно і зразумела. Кожны — унікальная асоба. Колькі людзей, столькі і меркаванняў. У кожнага свая праўда. У кожнага свой лёс. Таму апісваць свой уласны творчы і жыццёвы вопыт — перспектыўны кірунак. Памятаю, як пісьменніца і мастацтвазнаўца Галіна Багданава часцяком паўтарала на сваіх лекцыях: «Так, як вы, ніхто не напіша. А таму няважна, што пра гэта ж нехта напісаў да вас». Вось і атрымліваецца, калі пішаш пра сябе, можна пісаць пра ўсё. Таму што жыццё ў кожнага рознае. Многія пісьменнікі ў той ці іншай ступені карыстаюцца гэтым прыёмам. Кожны — па-рознаму. Многія ствараюць псеўдааўтабіяграфіі, каб стварыць інтрыгу, абрасці легендамі або проста з-за любові да містыфікацый. Па-свойму падышоў да гэтага пісьменнік Андрэй Федарэнка.

«Мяжа» («Літаратура і Мастацтва», 2011) Андрэя Федарэнкі — гэта раман-эсэ, нататкі пісьменніка, які не можа знайсці «хвабулу» для будучага рамана. І пошукі фабулы прыводзяць яго да глабальных развяг пра творчасць і літаратуру наогул. Магчыма, якраз за гэтую тэму кніга Андрэя Федарэнкі «Мяжа» і была адзначана літаратурнай прэміяй Ежы Гедройца (разам з кнігамі «Зборная РБ па негалоўных відах спорту» Паўла Касцюкевіча і «Малая медычная энцыклапедыя Бахарэвіча» Альгерда Бахарэвіча). Творчасць і творчая асоба — гэта аб'екты, вартыя пільнай увагі і даследавання. Акурат гэтаму даследаванню ўнутранага свету творчага чалавека і прысвечана не толькі кніга «Мяжа», а наогул большая частка творчасці Федарэнкі. Ён разважае пра літаратурныя пакаленні, рэальнага і ідэальнага чытача, увогуле, аб прыродзе творчасці і яе неабходнасці. У гэтым кантэксце літаратурная прэмія імя Ежы Гедройца — невыпадковая прэмія для Беларусі. Па-першае, сам літаратар, рэдактар выдатнага часопіса «Культура», што выдаваўся ў Парыжы, нарадзіўся ў Мінску. А па-другое, у сваёй творчасці ён заўжды імкнуўся аналізаваць працэсы, якія адбываліся ў сусветнай культуры.

Некаторымі сваімі развагамі пра літаратурныя прэміі, сучасны літаратурны працэс, «Мяжу» і чытачоў Андрэй ФЕДАРЭНКА падзяліўся са «Звяздой». Шчыра, пранікнёна, па-пісьменніцку, па-філасофску:

— У мяне зараз няма, так як раней, адказаў на ўсё. У маладзейшыя гады для мяне не было такога пытання, на якое б я не адказаў у любы час дня і ночы: што такое Бог, жыццё, літаратура? Але чым далей, тым у мяне менш гэтых адказаў. У мяне ўражанне, што я памру з абсалютнай думкай, што я не ведаю нічога. Дакладней, не магу сфармуляваць тое, што ведаю.

**— Чаму? У «Мяжы» вы даяце даволі шмат варыянтаў адказаў на розныя экзістэнцыйныя пытанні.**

— Так, некаторыя гавораць, што кніга вучыць мысленню... І хіба важна, на маёй біяграфіі грунтуецца кніга ці на чыёйсьці іншай! Дарэчы, шчыра кажучы, ніякая «Мяжа» не біяграфічная. Гэта псеўдааўтабіяграфія. Розніцы ж няма. Абы кніга давала той імпульс, які дае літаратура.

**— Але там жа ёсць нейкія біяграфічныя моманты ці вы наогул усё прыдумалі?**

— Там ёсць роўна столькі, колькі мне патрэбна было для пастаўленай задачы. Гэта элемент «набокаўшчыны», нічога арыгінальнага. Мы ведаем мільён выпадкаў, калі біяграфіі прыстасоўваліся пад пісьменніцкую задачу. Больш за тое, любы мастацкі твор — гэта псеўдааўтабіяграфія. Я б на месцы незаангажаванага крытыка ўспрымаў гэта як мастацкі твор, абсалютна выдуманы, галоўнага героя якога выпадкова — па дурасці ці па хітрасці — завуць так, як аўтара...

**— Калі вы пішаце, вы ж не разлічваеце на канкрэтнага чытача?**

— Не, ніколі. У маладыя гады было, так сказаць, адраснае пісанне, калі я пісаў для падлеткаў, напрыклад. Але гэта іншае. І калі зараз мне амаль 50 гадоў, да мяне нарэшце дайшло, што напісаць твор — справа дзясятая. Спачатку трэба стварыць чытача. Ён можа быць з мінулага. Яго можа не быць у рэальным жыцці...

Адной часткай галавы ты ствараеш уласны твор, а другой — таго, хто гэта будзе ўспрымаць. Гэта ні ў якім разе не павінен быць нехта канкрэтны.

**— Вы гаворыце пра ідэальнага чытача?**

— Пажадана, каб ён быў ідэальны, але... Будучага чытача, чытача, якога няма ў прыродзе, але аўтару вельмі хацелася б, каб ён быў. Ідэальнага чытача ўсё-ткі з горам напалам можна ўявіць... А я кажу пра чытача будучага. Чытач, якога няма, але які будзе, калі нас не будзе. Гучыць прэтэнцыёзна, але гэта вельмі дапамагае падчас працы. Таму чытачу усё роўна, хто я, якая была мая біяграфія і г. д. Ён будзе зыходзіць толькі з тых «біятокаў», якія будуць ісці ад тэксту. Я з гэтым чытачом знітоўваюся ў працэсе пісьма. Калі я не бачу таго, будучага чытача, то ў мяне не атрымаецца нічога і для цяперашняга.

**— Ці спрыяюць літаратурныя прэміі развіццю літаратуры і набліжэнню літаратуры да чытача?**

— У ідэале, чым больш іх было б, тым лепш: у паэзіі, у прозе, па некалькі розных на месяц. Каб яны былі разбіты па намінацыях: дзіцячая, рэалістычная, мадэрнісцкая, авангардная проза і г.д. Гэта было б такім літаратурным рухавіком! І паглядзіце: там, дзе «ўсплывае» грашовая сума, наколькі чытачы актывізуюцца. Яны думаюць: гэта ідзе не проста дзядзька-пісьменнік, а той, які за 5 хвілінаў зарабіў столькі, колькі я за 5 гадоў зарабляю. Значыць, гэта важны чалавек, ён зрабіў важную рэч. Гэта без іроніі. Літаратурныя прэміі з грашовымі ўзнагародамі вельмі важныя для нашай літаратуры. А для пісьменніка — і пагатоў! Гэта ўзнімае яго статус. Ужо не кажучы пра тое, што многія пісьменнікі ў прамым сэнсе маюць патрэбу... У нас жа ж не тое, што хаця б у Расіі: там столькі прэмій, столькі фондаў! Так што, чым больш літаратурных прэмій, тым лепш.

**— Што адбываецца сёння ў беларускай літаратуры?**

— Гэта такая тэма, якую я ўздымаю перад напісаннем кожнага новага твора. Напрыклад, калі аповесць пішацца 4 месяцы, 3 з іх ідзе на разборку таго, навошта яна, у якім стане знаходзіцца наша літаратура, куды яна рухаецца, ці яна развіваецца, ці наадварот... Гэта тыя пытанні, якія будуць стаяць пастаянна. Як толькі на іх знойдзецца кароткі адказ з кропкаю ў канцы, літаратурны працэс страціць сэнс....

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# «Палёт» даўжынёй у 32 гады

**Сёлета выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» святкуе 45-годдзе сваёй дзейнасці. Зборнік паэзіі Андрэя Скарынкіна «Маттиолы» стаў першым праектам юбілейнага года. І даволі ўдалым.**

«Маттиолы». Даволі дзіўная назва. Але выбрана яна невыпадкова, бо гэтыя кветкі — любімыя ў паэта. Іх матыў праходзіць скрозь увесь зборнік, у якім усё вытанчана і арганічна. Удалае колеравае афармленне вокладкі, бездакорна белыя старонкі і глыбокія па сэнсе вершы. Іх тэматыка вельмі шырокая і разнастайная, бо напісаны яны на працягу 30 гадоў. Дарэчы, самаму «даросламу» вершу ўжо 32 гады. Многія творы адлюстроўваюць час і падзеі, што хвалявалі аўтара. Таму не дзіўна ўбачыць тут рыфмаваныя водгукі на такія трагедыі, як цунамі ў Індыйскім акіяне, гібель людзей на Нямізе. Аднак значная частка вершаў прысвечана тэмам, якія ніколі не губляюць актуальнасці, — гэта каханне, прырода, Радзіма, Бог, дзяцінства. Звычайныя з'явы жыцця Скарынкін падае цікава і паэтычна.

— Гэтая кніга «нарадзілася» вельмі хутка, — расказвае паэт. — Тут сабраны вершы з часоў, калі я быў пілотам грамадзянскай авіяцыі, і да сённяшніх дзён. Па іх можна прасачыць творчае сталенне, убачыць тыя праблемы, якія хвалявалі мяне ў той ці іншы перыяд. На мой погляд, гэтыя творы не самыя лепшыя, затое лірычныя і праймальныя.

Увогуле, кожны верш утрымлівае штосьці з жыцця аўтара. Гэта надае радкам шчырасці і праўдзівасці.

...У спякотныя летнія дні маціёлы не здаюцца асабліва прываблівымі кветкамі. Але як толькі надыдзе вечар, яны напаўняюць паветра лёгкім водарам свежасці. Разгорнеш кнігу Андрэя Скарынкіна — і можна адчуць прыемны водар паэзіі. Галоўнае, час для гэтага выбраць адпаведны.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Продавец: Открытое акционерное общество «Мостоотряд №425», г. Витебск, ул. Мясникова, 3, тел. 8 (0212)35 82 61, 8(0212) 35 82 66.**
**Организатор аукциона: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика | Начальная цена В т.ч. НДС (бел. руб.) | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобильный тягач КАМАЗ-5410, 1989 года выпуска, инв.№9047, гос.№0688-2, кузов №0205143, серого цвета | 31 680 000 | 3 168 000 |

**Торги состоятся 12 апреля 2012 года в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления для участия в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5. Прием документов начинается 12.03.2012 в 8.30 и заканчивается 11.04.2012 в 17.30.

Для участия в торгах приглашаются юридические, физические лица и индивидуальные предприниматели, имеющие право принимать участие в торгах.

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы.

2. Лицами, желающими принять участие в аукционе, к заявлению прилагается: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность. При подаче документов предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

4. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в размере 543 810 бел. руб. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан заключить договор купли-продажи не позднее 20 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона; оплатить предмет аукциона согласно сроков, указанных в договоре купли-продажи.

6. Организатор торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения торгов.

**7. Дополнительную информацию можно получить по тел: 8(0212) 42 61 62, 8(029) 510 07 63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

# СУСТРЭНЕМСЯ ПРАЗ 100 ГАДОЎ,

## або Рэцэпт вечнай маладосці

**«Апавяданні і вершы, 52 выкрайкі, завочныя курсы кройкі і шыцця, 300 касметычных рэцэптаў, 1000 рэцэптаў танных і смачных страў, 200 парад па дамаводстве. Адказы на інтымныя пытанні». Гэта — анонс часопіса «Женщина и хозяйка», чатыры нумары якога на гарышчы бацькоўскага дома знайшоў гамяльчанін Аляксандр Ласіца. Знайшоў і падарыў музею гісторыі Гомеля, які адразу ж прэзентаваў новую сакавіцкую экспазіцыю. У ёй не толькі часопісы, але і сапраўдныя рэчы, якія належалі жанчынам пачатку XX стагоддзя. Прыгажуні пазіраюць з фотапартрэтаў, а іх нашчадкі здзіўляюцца: аказваецца, інтарэсы слабага полу за мінулыя 100 гадоў амаль не змяніліся. Пачытаем і мы часопісы, выдадзеныя яшчэ да падзей 1917 года.**




У адным з нумароў за 1917 год цэлая старонка аддадзена правам жанчын, у іншым — сучаснай ролі працуючай жанчыны. Цытата: «Умовы, створаныя вайной, запатрабавалі вельмі шырокага прымянення жаночай працы і адразу далі жанчыне магчымасць заняць аднолькавае становішча з мужчынам і самастойна ўладкоўваць сваё жыццё. Бясспрэчна толькі адно: узнікненне канкурэнцыі паміж мужчынскай і жаночай працай, якая прывядзе да паніжэння заробку». Чым не прароцтва?

Падзеі Першай сусветнай вайны адбіваюцца на змесце гламурнага часопіса, і вось ён ад імя радавых бранявога аўтамабільна-чыгуначнага ўзвода дзейснай арміі Собалева, Чарнякова, Філіпцова, Гур'ева, Філіповіча заклікае чытачак: «Адгукніцеся! Падзяліцеся з намі часткай вашых інтарэсаў і пачуццяў. Для нас каштоўны кожны радок вашых лістоў!»

Але ж гэта, відаць, даніна павагі грамадству — як зараз калонка галоўнага рэдактара ў гламурным «Cosmopolitan». У асноўным жа аб'ёмны часопіс напоўнены адвечнымі праблемамі жанчыны: у што апрануцца і чым накарміць дарагіх і любімых. Мне асабіста спадабалася наступная прапанова: «Сукенка для тэатра або для візітаў колеру электрык. Каўнер, манжэты, канцы пояса і ніз абшыты вузкай паласой з футра малпы». Прынамсі, варыянты ёсць на любы густ і памер. Маленькія модніцы з дапамогай маці могуць таксама выбраць і заказаць фасончык, што даспадобы. Не праз інтэрнэт, як зараз. Накладзеным плацяжом. І цэны тут жа: рамантычны капялюшык каштуе ад 5 да 8 рублёў.

Жанчыны, чые інтарэсы выходзілі за межы колеру самай моднай кашулі, відаць, чыталі, і магчыма, карысталіся як інструкцыяй падрабязнымі артыкуламі пра тое, як займацца фатаграфіяй у хатніх умовах. Ужо тады крохкія і вытанчаныя праходзілі выпрабаванне чорным пакоем, у якім патрэбна было перазараджаць касету. А вось калі мужчын даганяць — дык лепш за ўсё на лыжах, — прапануе «Стары спартсмен» і заклікае прыгажунь заняцца «лыжабежным спортам».

Гартаем далей і знаходзім: «Мыццё паміж справамі». Вось тут можна паспачуваць прабабулькам. Аднак звярніце ўвагу на падыход да праблемы стогадовай даўніны: «У наш мітуслівы і цяжкі час вядзенне гаспадаркі прычыняе клопаты і смутак. Дзень мыцця — да вядомай ступені панічны, ён пераварочвае ўвесь уклад гаспадаркі. Між тым ёсць спосаб, дзякуючы якому мыццё бялізны страчвае свой катастрафічны характар. І пры гэтым — эканомія мыла (пры сённяшніх цэнах гэта не драбяза), поўнае захаванне бялізны і эканомія вады».

І чым жа мы адрозніваемся? Знаходжу і рэкламную старонку: «Я дасылаю слабым, нервовым жанчынам ДАРМА 500 пакетаў сродку «Альбукола». Як вы разумееце, дармовая панацэя выратуе няшчасных ад усіх хвароб адразу. Дарэчы, праз часопіс можна набыць «сродкі супраць недахопаў скуры твару», памаду для вуснаў і нават «апарат для выпраўлення формы насоў».

Калі хтосьці лічыць, што пакупнікоў у крамах пачалі масава ашукваць у наш час, зазірніце ў артыкул, напісаны ў пачатку мінулага стагоддзя, пад назвай «Падробкі харчовых прадуктаў». І вы даведаецеся, што: «Маргарын даў штуршок чалавечаму вынаходніцтву. За штучным сметанковым маслам з'явіліся нават штучныя яйкі. Сыр — таксама пакутнік фальсіфікацый. У каўбасы шчодрай рукою дадаюць муку». Не бачылі яны той рэкламы кітайскіх прадуктаў, у якой усе стравы гатуюцца з парашкоў рознага колеру! Пагляддзелі б нашы продкі на спіс «Е» на любым прадукце, не скардзіліся б, што колер сметанковага масла падфарбоўваецца.

Абмінуць прапановы акультысткі Клары дэ Мансэ проста нельга. Паслугі па вызначэнні «характару па почырку, па лініях рукі, па рысах твару, а таксама гараскопы на адзін год» каштуюць «1 рубель і 2 дзесяцікапеечныя маркі для перасылання адказу заказным лістом» кожная. Здаецца, дама без справы не сядзела, бо на дзвюх перадапошніх старонках кожнага нумара надрукаваны яе шматлікія опусы. Гэта вам не ў інтэрнэце на пытанні псіхалагічнага тэста адказваць! Цытую спадарыню дэ Мансэ: «Вы дарма спрабуеце пісаць левай рукой і з арфаграфічнымі памылкамі. Нічога, акрамя сваёй ілжывасці, вы гэтым не даказалі, а спецыфічных рысачак характару не ўтаіце, калі б пісалі нават нагой. Я ясна бачу, што вам даводзілася мець праблемы не толькі з мараллю, але і з крымінальным кодэксам».

Ці вось гэта. Мне здаецца, вы ўжываеце нейкі наркотык, верагодна, какаін, і менавіта таму так знервавалася ваша душа. У вашу будучыню страшна зазірнуць: вы стаіце на небяспечным шляху і, калі своечасова не апамятаецеся, скончыце дрэнна. Спыніцеся ж, пакуль не позна!»

Дарэчы, з вывучэння зместу часопісаў становіцца зразумелым, што яго чытачамі былі не толькі жанчыны. Мужчыны, аўтары пісьмаў у рэдакцыю, падпісваліся: «Марак», «Футбаліст», «Лерыган», «Агнус», «Сандрыльон», «Піон». Нарцысаў не знайшла. Жанчыны сваю сутнасць выказваюць у асноўным праз класічныя кветкавыя вобразы: «Белая Лілія», «Паўднёвая Ружа». Але ж сустракаюцца і «Цыганка», «Моцная духам», «Брунетка», «Сінявокая Зіна», «Кінутая».

Прынамсі, астатняя частка старонак часопіса запоўнена рэцэптамі страў. У штотыднёвіку, каб гаспадыня не замарочвалася, даецца разгорнутае меню на кожны дзень тыдня адпаведна з календаром. Сумняваюся, што 100 гадоў таму, як і зараз, дамы карысталіся ўсімі рэцэптамі, якія ім прапаноўвалі. Але ж канкрэтныя экзэмпляры выдання захавалі выразныя тлушчавыя плямы. Значыць, на стале для гатавання ежы яны пабывалі. Так што, паважаныя жанчыны і гаспадыні, а таксама мужчыны і гаспадары, мае калегі-журналісты не дарма елі свой хлеб, калі нам і сёння цікава гартаць тагачасныя «Cosmopolitan», «Burda», «Лізу» і нешта яшчэ... Магчыма, хтосьці і нас пачытае. Праз 100 гадоў. Здзівіцца, усміхнецца, задумаецца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# БОС. НА АБЦАСАХ І З МАНІКЮРАМ

**Такога і слухацца прыемна, і пярэчыць яму не хочацца. А беларускія жанчыны ўмеюць быць не толькі прыгожымі, пяшчотнымі і прывабнымі, але і моцнымі, самадастатковымі. Ды і ў бізнэсе разбіраюцца не горш за мужчын. Гэта маюць намер пацвердзіць удзельніцы першага рэспубліканскага праекта для дзелавых і паспяховых жанчын «Лэдзі Бос», які стартуе 13 сакавіка пры падтрымцы інтэрнэт-рэсурса LADY.TUT.BY.**



**Кіраўнік LADY.TUT.BY. Святлана ЗЭРЭ *(злева)* і дырэктар прадпрыемства «Каралева агню» Ала ДЗЕЦКАЯ падчас прэзентацыі праекта «Лэдзі Бос».**

Жанчыны, якіх называюць «амазонкамі ад бізнэсу», па словах арганізатараў праекта, атрымаюць дзякуючы яму магчымасць ярка прадставіць сваю кампанію і завязаць карысныя дзелавыя стасункі, бо сярод удзельніц — бізнэс-лэдзі з самых розных сфер дзейнасці.

— Мы спецыяльна зрабілі так, каб удзельніцы не былі канкурэнткамі. Калі было дзве заяўкі з адной сферы, мы выбіралі тую, якая падавалася першай, — патлумачылі арганізатары.

На працягу двух тыдняў канкурсантак чакаюць самыя розныя мерапрыемствы: трэнінг вядомага літоўскага бізнэс-трэнера Ірыны Пуронене, дабрачынная акцыя ў дзіцячым сацыяльным прытулку ў Бараўлянах, гульня ў «Мафію», «абмен» бізнэсам на адзін дзень. А паказаць сваю жаноцкасць і прывабнасць давядзецца на заключным вечары. Там, напрыклад, будзе дэманстрацыя вячэрніх строяў, як на конкурсе прыгажосці.

— Бонусаў, якія дасць гэты праект, дастаткова, — мяркуе адна з удзельніц, дырэктар салона мэблі «Чорная кошка» Кацярына Ермашкевіч. — Гэта і прасоўванне брэнда, і новыя знаёмствы. А яшчэ — здаровае і захапляльнае пачуццё спаборніцтва і адрэналін.

Дарэчы, да ліку бонусаў, якія атрымае будучая ўладальніца тытула «Лэдзі Бос — 2012», можна аднесці азартны прыз — фішкі ад казіно «Вікторыя» на суму 1000 долараў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся калектыў педагогаў «Дапаможная школа-інтэрнат № 7». У гэтай школе вучацца і жывуць дзеці з інтэлектуальнай недастатковасцю, якія засталіся без апекі бацькоў. Педагогі занепакоены тым, што разглядаецца пытанне ліквідацыі гэтай адзінай у сталіцы ўстановы для такіх дзяцей…**




**«У краме —**
**крызіс, таму зранку**
**Прадаюць...**
**абсталяванне».**
**Гумарысты ўсёй краіны**
**амаль дзесяць гадоў**
**Яднаюцца вакол звяздоўскага**
**конкурсу «Хто каго?»**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### КУЛІНАРНАЕ ПАДАРОЖЖА

## «ПОЛЬСКА ПАМІДОРОВА ЗУПКА»



***Спатрэбіцца:*** *морква — 1 шт., цыбуля — 1 шт., пятрушка (корань) — 1 шт., памідор (можна замарожаныя або ва ўласным соку) — 6-8 шт., таматная паста — 1 ст. л., рыс — 3 жменькі, масла сметанковае — 100 г, соль, перац чорны, зяляніна, смятана.*

Цыбулю рэжам кубікамі. Моркву і каранёвую пятрушку надзіраем на буйной тарцы. Усё абсмажваем на сметанковым масле (для тых, хто пасціцца, можна замяніць на алей) да залацістага колеру. Складваем усё ў каструльку і заліваем вадой. Варым на сярэднім агні. Вядома, цяпер не зусім памідорны сезон. Можна выкарыстаць замарожаныя памідоры або памідоры ва ўласным соку. Яны цалкам натуральныя, нават без солі. І што самае добрае — ужо без скуркі. Рэжам памідоры на дробныя кавалачкі і праціраем іх праз сіта. Свежыя або марожаныя памідоры спачатку рэжам напалову, крыху тушым і таксама праціраем праз сіта. Дадаём усё ў нашу «зупку». Туды ж даліваем 300 грамаў таматнага соку або 1-2 ст. лыжкі таматнай пасты. Солім, перчым і даводзім да кіпення. Высыпаем 3 жменькі рысу. Пад накрыўкай варым на сярэднім агні хвілін 15. Спрабуем на соль (рыс любіць соль). Калі трэба — дасольваем. І варым яшчэ хвілін 5 да гатоўнасці рысу. Дадаём зяляніну. Смятану кладзём ужо кожнаму ў талерку.

## КІТАЙСКАЯ ТОНКАЯ ГАЛЕТА

***Спатрэбіцца:*** *мука пшанічная — 450 г, вада — 300 мл, алей — 1 ст. л.*



Гэта не лаваш. Акрамя мукі і вады, спатрэбіцца трохі цярпення, каб тонка раскачаць, але калі вы хоць раз самастойна рабілі лаваш, то цяжкасцяў не паўстане. А зробіце другі, трэці раз — прыйдзе і навык. Галетамі можна замяніць хлеб і гатаваць розныя стравы, як і з лавашом. Іх можна захоўваць доўгі час у халадзільніку.

Высыпаем муку ў міску. Ваду закіпяцім, дадаўшы ў яе раслінны алей. І ўліваем ваду тонкім струменьчыкам у муку. Змешваем. Замясіўшы цеста, накрыем яго сурвэткай і пакінем адпачываць 30 хвілін. Затым падзелім цеста на тры часткі, кожную раскачаем у каўбаску і разрэжам на 8-10 частак. Пасля кожную з частак вельмі тонка раскачваем. У дыяметры павінна быць прыкладна 15 см. Абсмажваем адну за другой на сухой патэльні (без алею) на слабым агні з двух бакоў. Гатовыя галеты выкладваем на вільготны ручнік.

**-2832-**

### ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

## ПА СЛІЗКАЙ ДАРОЖЦЫ...

Веснавое сонейка стараецца ваўсю, змываючы пачарнелы снег з вуліц і дарожак. Але зіма не вельмі спяшаецца здаваць пазіцыі, ператвараючы за ноч дарожкі і тратуары ў сапраўдныя каткі. Як зрабіць, каб ісці ўпэўненым крокам, а не станавіцца падобным да вядомай жывёлы з анекдота?

На жаль, не існуе парады, якая дапамажа вырашыць праблему раз і назаўсёды, але ў самы экстрэмальны час можна сябе падстрахаваць, скарыстаўшыся наступнымі парадамі:

- Падэшва ботаў не будзе слізгаць, калі па ёй час ад часу праводзіць наждачнай паперай.
- Бульба таксама дапаможа: проста натрыце падэшву разрэзанай бульбінай.



- Любым добра разагрэтым металічным стрыжнем можна зрабіць рэльефны малюнак на падэшве.
- Прылеплены кавалачак лямцу на абцас абутку таксама дапаможа не слізгаць.
- Ёсць адмысловыя «снегаходы», якія надзяваюцца на любы абутак, нават на абцас. Яны чымсьці нагадваюць альпінісцкія «кошкі», толькі нашмат меншыя па памерах. Выглядаюць досыць эстэтычна. Акрамя таго, у іх яшчэ і расфарбоўкі розныя — на любы густ.
- Можна на падэшву прыляпіць звычайны лейкапластыр, які прадаецца ў аптэках у рулончыках. Да працы дайсці хапае.
- Можна на падэшву наляпіць кавалачак наждачнай паперы — толькі пажадана на суперклей.
- Можна ўзяць антыкаразійны спрэй на бітумнай аснове (тыпу body), наляпіць скотч, каб не запэцкаць бачную частку падэшвы, нанесці спрэй і прасушыць 10—15 хвілін. Хапае на 1,5 тыдня.
- Можна намазаць падэшву клеем, пасыпаць на клей пяском і даць высахнуць. Дзень можна прахадзіць.

### ПАРАДАК У ДОМЕ

## ВЫБІВАННЕ МЯККАЙ МЭБЛІ Ў ПАКОІ БЕЗ ПЫЛУ



Вы ведаеце, як выбіваць дома ў пакоі мяккую мэблю?

Усё проста. Для гэтага трэба намачыць прасціну і адцісnуць, каб яна была вільготнай, накрыць прасцінай канапу, і проста праз яе выбіць мэблю. Пылу не будзе, ён асядзе на мокрай прасціне са зваротнага боку. Потым проста памыйце прасціну, і ўсё.

**-2833-**

■ Спорт

# СуперГомель

**У карэннага жодзінца, трэнера футбольнага клуба «Гомель» Алега Кубарава яшчэ ў юнацтве з'явілася кароткая, але ёмістая мянушка — «Бэст». Маўляў, не толькі гуляў, як вялікі Джордж Бэст, але і імкнуўся заўжды быць лепшым. І як паказвае час, рабіў правільна: у Кубарава пакуль усё атрымліваецца. У мінулым годзе «Гомель» завалодаў Кубкам Беларусі, бронзавымі медалямі чэмпіянату, а зараз — у матчы-адкрыцці сезона за Суперкубак Беларусі — яго хлопцы ўпэўнена перайгралі БАТЭ (2:0) і ўпершыню сталі ўладальнікамі гэтага саліднага трафея.**




Фота Пятра ФАМІНА.

На працягу ўсёй сустрэчы, якая сабрала аншлаг у мінскім футбольным манежы, гомельскі «коўч» быў стрыманым. І нават галявыя залпы Вячаслава Глеба ён успрымаў неяк сціпла, на волю пачуцці не выпускаў.

— Цяжкая гульня, — спакойна падсумаваў вынік Алег Міхайлавіч. — Асабліва ў пачатку матча, калі нам даравалі. Але каманда цудоўна згуляла ў абароне. Рады, што ў такім складаным матчы мы перамаглі, пры тым, што аддалі тэрытарыяльную перавагу БАТЭ.

Яшчэ напярэдадні шанцы на перамогу аддавалі барысаўчанам. І не дзіўна, бо, у адрозненне ад апанента, каманда Віктара Ганчарэнкі ўзмацнілася перад чэмпіянатам даволі моцнымі футбалістамі. «Гомель» — наадварот, згубіў адразу некалькіх ключавых гульцоў. Сярод іх і добра вядомы Ігар Стасевіч, які падпісаў працоўную дамову з мінскім «Дынама».

— Нам бы сабраць каманду, каб яна дастойна выступіла ў чэмпіянаце. Сёння пра іншае і не думаем, — напрыканцы прэс-канферэнцыі дадаў трэнер «Гомеля».

Нягледзячы на пэўныя праблемы, каманда ў горадзе над Сожам добрая. Паслухмяна выканала трэнерскае заданне і не саступіла славутаму апаненту ў ніводным складніку. Якасная гульня ў абароне, колкія контратакі, добрае выкананне стандартных становішчаў — тыя козыры, якімі напоўніцу скарысталіся гамяльчане. Між іншым, аўтарам дубля ў матчы за Суперкубак стаў **Вячаслаў ГЛЕБ**, які пасля чарговай вандроўкі вярнуўся на радзіму і стаў героем паядынку.

**— Вячаслаў, такім чынам вы добра адказалі сваім крытыкам?** — ужо пасля цырымоніі ўзнагароджання пытаемся ў малодшага з Глебаў.

— Няправільна гэтак казаць. Крытыка ёсць нармальная і адэкватная. Да яе і прыслухоўваюся.

Гульня БАТЭ была непераканаўчай, амаль без небяспечных момантаў. Дарэчы, Віктар Ганчарэнка так і прызнаўся пасля матча, што на поле быў набор гульцоў, але каманды не было. Жаданне ў асобных футбалістаў сапраўды прысутнічала, аднак агулам спробы барысаўчанаў нагадвалі разабраны канструктар, які ніхто не наважыўся сабраць.

Пакідаць поле камандам прыйшлося ў даволі розных эмоцыях: шчаслівыя гамяльчане адказвалі на пытанні журналістаў, атрымлівалі віншаванні ад блізкіх, а барысаўчане хутка імкнуліся пакінуць пляцоўку. Пачатак сезона атрымаўся крыху нечаканым, крыху сенсацыйным. Але, па вялікім рахунку, галоўнае тое, што ён не пакінуў нікога абыякавым. Футбольны год мусіць быць цікавым.

**Тарас ШЧЫРЫ**

## Дзве даты

## 10 сакавіка

**1814 год** — спартсмены Мінска прынялі ўдзел у II Усерасійскай алімпіядзе, якая праходзіла ў Рызе. Гіравік А. Александровіч заваяваў званне чэмпіёна Расіі ў паўцяжкай вазе, Аляневіч у той жа катэгорыі заняў 2-е месца, а штангіст В. Сакалдзінскі ўстанавіў рэкорд Расіі ў жыме штангі ў лёгкай вазе.



**1958 год** — нарадзілася выдатная амерыканская актрыса Шэран Стоўн. Як і належыць кожнаму амерыканскаму падлетку, працаваць дзяўчына пачынала ў Макдональдсе, звычайнай касіркай. А сёння актрыса валодае ўласнай прадзюсарскай кампаніяй. Былая фотамадэль і музыкантка Шэран Стоўн дэбютавала ў 1980 годзе ў фільме Вудзі Алена «Успаміны зорнага пылу». Але толькі ў 1992 годзе роля ў «Асноўным інстынкце», ад якой адмовіліся многія вядомыя галівудскія актрысы, нарэшце, прынесла Стоўн тое прызнанне, якога яна прагнула шмат гадоў. Сярод іншых папулярных фільмаў з яе ўдзелам можна назваць «Успомніць усё», «Нажніцы», «Скрыжаванне», «Казіно». Шэран — маці двух усыноўленых дзяцей. Адзін з хлопчыкаў народжаны сурагатнай маці.

## Было сказана:

**Алесь Ставер (1929—1995), беларускі паэт:**

***«Цаніце Працу, Чалавека, — і Бог вам дасць спагадны лёс».***

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.36 | 19.05 | 11.29 |
| Віцебск — | 7.27 | 18.53 | 11.26 |
| Магілёў — | 7.26 | 18.55 | 11.29 |
| Гомель — | 7.22 | 18.52 | 11.30 |
| Гродна — | 7.51 | 19.20 | 11.29 |
| Брэст — | 7.51 | 19.22 | 11.31 |

**Месяц**
*Поўня 8 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Тараса.*
***К.*** *Яўгеніі, Аляксандра, Макара, Цыпрыяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




У гэты цудоўны вясновы дзень віншуем дарагую нашу матулю, бабулю, прабабулю **Настассю Сцяпанаўну ДЗІРКО** з в. Красналукі Чашніцкага раёна **з 90-годдзем.** З гэтай нагоды жадаем самаму дарагому нам чалавеку моцнага здароўя, бадзёрага настрою, радасці ад дзяцей і ўнукаў.

**Любячыя цябе дочкі і іх сем'і.**

Паважаная **Раіса Васільеўна КРУЧОНАК** з Мінска!

**У юбілейны дзень нараджэння** прыміце ад нас, былых калег па працы, шчырыя віншаванні з пажаданнямі здароўя, жыццёвага аптымізму, увагі і павагі ад родных і блізкіх. Няхай кожны дзень для вас будзе светлым на радасць нам і ўсім сваім!

Дарагі муж, татачка, свёкар, дзядуля, шаноўны, добразычлівы **Уладзімір Канстанцінавіч КРЫВАДУБСКІ** са Слуцка!

Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды **дня нараджэння!** Зычым вам здароўя, сямейнага дабрабыту, павагі ад родных і блізкіх, а ад мяне вялікі дзякуй за добрасумленную працу ў якасці старшыні бацькоўскага класнага камітэта ў СШ № 3. Заставайцеся і надалей такім прыстойным, паважлівым і абавязковым, якім мы вас ведаем.

**Вашы родныя і Новік Т.І.**

Віншую **Зінаіду Канстанцінаўну ЦЮКАЛО** з г. Бярозаўка Лідскага раёна **з 60-годдзем!** Зычу ёй і ўсім яе родным моцнага здароўя, поспехаў ва ўсіх яе справах, як мага больш сонечных дзён у яе жыцці, сапраўды надзейных сяброў і жадаю, каб шчасце не блукала па дарозе, а сядзела ў яе хаце на парозе.

**Кацярына Турык.**

**ЗВЯЗДА** БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь**

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

**Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.**

**НАШ АДРАС**: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

**http://www.zviazda.by;**

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: rek@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 1085.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 сакавіка 2012 года.